

**Другое жыццё палаца**

СТАР. 3



**Беласток добра, а Гудзевічы — лепш?**

СТАР. 5



**Барацьба — жаночы від спорту**

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 МАЯ 2018 г. АЎТОРАК № 100 (28716)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## КАЛІ ПАРТНЁРСТВА — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

**Гэтымі днямі адбываецца афіцыйны візіт намесніка старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Ван Цішаня ў нашу краіну. Высокага госця з Паднябеснай у Нацыянальным аэрапорце Мінск сустракаў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў. Там жа адразу прайшлі першыя перагаворы бакоў.**

Звяртаючыся да намесніка старшыні КНР, беларускі прэм'ер заявіў, што рады вітаць добрага, праверанага сябра беларускага народа. «Ваш візіт у Беларусь (першы замежны афіцыйны візіт Ван Цішаня ў новым статусе. — **«Зв.»**) вельмі цэнім і ўспрымаем як дадатковы добры знак настроенасці кітайскага кіраўніцтва на развіццё адносін з Беларуссю. Мы імкнёмся да таго, каб беларуска-кітайскія адносіны не толькі актыўна развіваліся, але і паказвалі прыклад для іншых краін, якімі яны могуць быць: пабудаванымі на добрасуседскай, узаемапаважлівай і раўнапраўнай аснове. Беларускае грамадства з разуменнем успрымае ідэю старшыні КНР Сі Цзіньпіна аб пабудове супольнасці адзінага лёсу. У аснове гэтай канцэпцыі — сацыяльная справядлівасць і аднолькавыя магчымасці развіцця для краін».

Падчас перагавораў у пашыраным складзе Андрэй Кабякоў адзначыў, што тавараабарот паміж нашымі краінамі расце штогод: у 2017-м гандаль з Кітаем перавысіў $3 млрд. «Тым не менш калі браць у разлік маштабы кітайскай эканомікі, то гэта зусім нязначная велічыня. У нас ёсць вялікія рэзервы для нарошчвання гандлёва-эканамічных сувязяў», — сказаў прэм'ер. Каб павялічыць беларускі экспарт у Кітай, кіраўнік Саўміна прапанаваў больш актыўна задзейнічаць кантэйнерныя чыгуначныя маршруты паміж Кітаем і Еўропай. Прэм'ер-міністр заўважыў, што нашы краіны паступова пераходзяць ад крэдытнага супрацоўніцтва да інвестыцыйнага, у якім ёсць праекты, што на дадзеным этапе патрабуюць паскарэння.

Беларускі прэм'ер прапанаваў зрабіць наступны год для нашых краін Годам адукацыі. «У мінулым годзе мы разам з маім калегам, прэм'ерам Дзяржсавета КНР Лі Кэцянам, абвясцілі 2018-ы Годам турызму Беларусі ў Кітаі. Прапаную зрабіць тэматычныя гады супрацоўніцтва добрай традыцыяй і абвясціць 2019-ы Годам адукацыі Беларусі і Кітая», — заявіў Андрэй Кабякоў і дадаў, што гэта дапаможа ўмацаваць сяброўскія сувязі паміж двума народамі.

Ван Цішань у сваю чаргу падзякаваў за цёплы прыём і сказаў, што «старшыня КНР Сі Цзіньпін надае вялікае значэнне адносінам з Беларуссю». Намеснік старшыні КНР таксама наведаў Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», пабываў у гандлёва-выставачным цэнтры.

«Мы бачым зацікаўленасць беларускіх інвестараў у тым, каб пастаўляць інавацыі, прадукцыю ў КНР. Калі б мы стварылі адмысловы прававы рэжым гандлю паміж «Вялікім каменем» і Кітаем, гэта было б вельмі карысна для развіцця парка, — падкрэсліў Аляксандр Ярашэнка, кіраўнік адміністрацыі парка. — Другая прапанова датычыцца так званага транспартнага зялёнага калідора паміж Кітаем, Расіяй, Беларуссю і Еўропай. Мы хацелі б, каб транспарт рухаўся па гэтым кірунку не даўжэй за 4-5 дзён».

Кіраўнік адміністрацыі парка адзначыў, што вядзецца актыўная работа з кітайскімі партнёрамі на міжрэгіянальным узроўні. «Мы вельмі зацікаўлены ў тым, каб нейкая моцная правінцыя Кітая стварыла субпарк у «Вялікім камені». Мы былі ў правінцыі Сычуань, прапаноўвалі губернатару ажыццявіць такі праект. Мы гатовыя аказаць поўнае садзейнічанне і стварыць усе ўмовы», — падкрэсліў ён.

Падчас сустрэчы Андрэя Кабякова з генеральным дырэктарам China Merchants Group Фу Ганфэнам быў абмеркаваны экспарт беларускай мяса-малочнай прадукцыі ў Кітай. «Мяне інфармавалі, што кітайскія партнёры выказваюць зацікаўленасць у павелічэнні аб'ёмаў экспарту беларускай мяса-малочнай прадукцыі ў Кітай, а таксама намер выступіць экспарцёрам і перавозчыкам названай прадукцыі. Урад Беларусі таксама зацікаўлены ў нарошчванні паставак шырокага асартыменту беларускіх харчовых тавараў у Кітай і гатовы аказваць у гэтым неабходнае садзейнічанне», — адзначыў прэм'ер-міністр.

China Merchants Group з'яўляецца заснавальнікам сумеснай кампаніі па развіцці Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» і яго найбуйнейшым інвестарам. Будаўніцтва ў сціслыя тэрміны сучаснага лагістычнага комплексу коштам звыш $120 млн пацвярджае сур'ёзнасць намераў карпарацыі і далей развіваць бізнес у Беларусі. «Мы высока цэнім ужо дасягнутыя вынікі супрацоўніцтва з кітайскімі партнёрамі і гатовыя яго ўсяляк развіваць. Урадам падтрымліваюцца планы China Merchants Group па фарміраванні на базе выставачнага цэнтра ў «Вялікім камені» сучаснага гандлёва-выставачнага комплексу з усёй адпаведнай інфраструктурай», — дадаў Андрэй Кабякоў.

Беларускі ўрад вітае стварэнне карпарацыяй у 2017 годзе інвестыцыйнага прамысловага фонду з заяўленым памерам інвестыцый $575 млн для падтрымкі праектаў у Беларусі. «Спадзяёмся на хутчэйшае адкрыццё офіса фонду ў індустрыяльным парку і пачатак яго актыўнай работы», — выказаў надзею кіраўнік урада.

Афіцыйны візіт намесніка старшыні КНР у Беларусь працягваецца да 29 мая.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# На бабулiных падушках



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Васьмігадовая Валерыя КАВАЛЕВІЧ з Лельчыцаў адпачывае на падушках, вышытых рукамі яе прабабулі Кацярыны Аляксееўны ПАНЧЭНІ — вядомай майстрыхі вышывання з вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Беларусь задаволена ходам перагавораў па ўступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Па сутнасці, у найбліжэйшы час мы, напэўна, узгоднім нашу пазіцыю з усімі асноўнымі ўдзельнікамі, акрамя ЗША. У ЗША свая асаблівая пазіцыя, якую мы яшчэ будзем канкрэтызаваць з імі. Наша краіна мае намер стаць рэгіянальным лічбавым цэнтрам. Гэта задача на сярэднетэрміновую перспектыву, і яна запатрабуе вырашэння мноства пытанняў — арганізацыйных, інфраструктурных, а таксама звязаных з адукацыяй. Рынак, пра які варта падумаць, — гэта фондавы. На жаль, у нас яго дынаміка росту недастатковая, хоць таксама нельга сказаць, што ён не развіты. Прынамсі, уся інфраструктура фондавага рынку ў нас працуе досыць эфектыўна».*

■ Добрая справа

## «МНОГІЯ СПАЧАТКУ ДЗІВІЛІСЯ, ЯК ГЭТА ІМ БЯСПЛАТНА БУДУЦЬ ДАПАМАГАЦЬ...»

### Цікавы сацыяльны праект стартаваў у Баранавічах

**Маладыя дзяўчаты-валанцёры з прафесійна-тэхнічнага каледжа сферы абслугоўвання бясплатна стрыгуць пажылых людзей, жанчынам фарбуюць валасы, могуць зрабіць укладку і манікюр. А чаму б і не? Нашы пенсіянеркі таксама хочуць быць прыгожымі!**

#### «Лічу сябе маладой. Яшчэ не вечар!..»

Зінаіда Аляксандраўна Педзь *(на здымку)* прыйшла ў Рэсурсны цэнтр каледжа зрабіць прычоску. У яе на сёння запланавана мерапрыемства: яна разам з мужам ідзе на сустрэчу з навучэнцамі каледжа, будзе расказваць пра сваё дзяцінства, якога насамрэч, можна сказаць, і не было — адабрала вайна. Зінаідзе Аляксандраўне 87 гадоў, выступаць перад публікай ёй не прывыкаць, яна ж былая настаўніца пачатковых класаў. «Хацела сёння надзець белую



спаднічку і туфлікі прыгожыя, — кажа гэтая мініяцюрная пажылая жанчына. — Але ногі набрынялі, да таго ж і халаднавата сёння, так што прыйшлося цалкам мяняць задумку. Выбрала цёплую сукенку, я яе ў гэтым годзе яшчэ не надзявала...» Сапраўднай жанчыне ў любым узросце не ўсё роўна, як яна выглядае.

З гэтым згодная і 77-гадовая Святлана Іванаўна Іванова, якая прыйшла сюды на манікюр. «Я лічу сябе маладой, — аптымістычна кажа жанчына. — Яшчэ не вечар...»

«Тут і стрыгуць бясплатна, — паведамляе яна. — Але я ўжо некалькі гадоў як хаджу да свайго цырульніка, ён ведае, чаго я хачу, што мне пасуе...» Доўгіх пазногцяў мая суразмоўніца не любіць, як і яркіх колераў, таму выбрала спакойны ружовы лак. Сапсаваць манікюр на дачы не баіцца па той прычыне, што яе няма. Тлумачэнне простае: «Муж памёр дзевяць гадоў таму, сын жыве ў Мінску, так што я адна. Навошта мне тая дача? Я купіла два вядры бульбы восенню, і мне іх хапіла на ўсю зіму...»

СТАР. 3

## СВОЕЧАСОВА ВЫЯВІЦЬ

### Каб лячэнне было паспяховым, рак важна знайсці на 1—2-й стадыях

**Штогод 50 тысячам беларусаў ставіцца несуцяшальны дыягназ — рак. Каля 270 тысяч хворых знаходзіцца на ўліку ў анкадыспансерах. Што рабіць, каб дыягназ не стаў прыгаворам? Выйсце адно — своечасова абследавацца і з любымі праблемамі са здароўем адразу звяртацца да ўрача, не чакаючы, пакуль стане зусім дрэнна.**

Як сцвярджае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей КРАСНЫ**, калі рак выяўляюць і пачынаюць лячыць на 1—2-й стадыях, 80% хворых папраўляецца. Ужо на трэцяй стадыі так званы пяцігадовы парог выжывання пераадольвае ўсяго палова пацыентаў. На 4-й стадыі, на жаль, размову можна весці толькі пра падаўжэнне жыцця і медыкаментознае аблягчэнне пакут хворага.

На ранняе выяўленне раку арыентуюць і медыкаў. У прыватнасці, як заявіў **першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ**, міжраённыя анкалагічныя дыспансеры ў хуткім часе будуць выконваць функцыі рэсурсных цэнтраў па скрынінгу. У перспектыве ў анкалагічных установах плануюць увесці дадатковыя стаўкі спецыялістаў, якія будуць займацца скрынінгам раку. Гэта дапаможа павысіць выяўляльнасць злаякасных утварэнняў на ранніх стадыях.

СТАР. 2

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ІТАЛІІ ПРАВАЛІЛАСЯ СПРОБА СФАРМІРАВАЦЬ УРАД

Кандыдат на пасаду прэм'ера Італіі Контэ вярнуў мандат прэзідэнту Серджа Матарэле.

Спроба сфарміраваць у Італіі кааліцыйны ўрад у складзе папулісцкага і антысістэмнага «Руху «5 зорак» і правай партыі «Ліга» скончылася правалам. Прафесар грамадзянскага права Джузэпэ Контэ, на якога гэты абавязак усклаў прэзідэнт краіны Серджа Матарэла, вярнуў мандат кіраўніку дзяржавы. Пра гэта паведаміў генеральны сакратар прэзідэнцкай канцылярыі Уга Дзампеці.

Увечары стала вядома, што прэзідэнт Італіі Серджа Матарэла прапанаваў эканамісту Карла Катарэлі ўзначаліць тэхнічны ўрад. Карла Катарэлі заявіў, што датэрміновыя парламенцкія выбары пройдуць у Італіі пасля жніўня, калі заканадаўцы адмовяць у даверы новаму ўраду. Катарэлі — эканаміст, у якога ёсць шматгадовы вопыт працы ў МВФ.

## СУСТРЭЧА ТРАМПА І КІМА ЎСЁ Ж РЫХТУЕЦЦА

Прадстаўнікі ЗША прыбылі ў КНДР для падрыхтоўкі сустрэчы амерыканскага прэзідэнта Дональда Трампа і паўночнакарэйскага лідара Кім Чэн Ына, піша The Washington Post.

Прэзідэнт Дональд Трамп абвясціў аб тым, што да гэтага часу разлічвае на сустрэчу 12 чэрвеня ў Сінгапуры з паўночнакарэйскім лідарам Кім Чэн Ынам. Пра гэта ён, як перадае Reuters, паведаміў, выступаючы перад журналістамі ў Белым доме.

«Мы выдатна спраўляемся з тым, што датычыцца саміту з Паўночнай Карэяй», — сказаў Трамп. «Перагаворы з прадстаўнікамі КНДР ідуць вельмі добра, таму мы разлічваем, што дамоўленасць аб сустрэчы 12 чэрвеня ў Сінгапуры не змянілася. Паглядзім, што будзе далей».

У сваю чаргу лідар КНДР Кім Чэн Ын пацвердзіў сваю «цвёрдую прыхільнасць» да правядзення саміту з прэзідэнтам ЗША 12 чэрвеня, паведамляе Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва Карэі (ЦТАК).

Нагадаем, што некалькі дзён таму, 24 мая, кіраўнік Злучаных Штатаў, рэагуючы на пагрозы КНДР адмяніць гэтыя перагаворы з-за ваенных вучэнняў Вашынгтона і Сеула на Карэйскім паўвостраве, абвясціў, што пасля такіх «варожых» заяў лічыць правядзенне саміту «недарэчным». Аднак праз некалькі дзён ён усё ж дапусціў, што сустрэча з Кім Чэн Ынам можа адбыцца па плане.

ISSN 1990 - 763X

## ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў БЕРЛІНЕ

Каля 25 тысяч чалавек прынялі ўдзел у дэманстрацыях у цэнтры Берліна 27 мая, паведамляе ТАСС са спасылкай на агенцтва Reuters.

Каля 5 тысяч дэманстрантаў, якія падзяляюць погляды германскай правай партыі «Альтэрнатыва для Германіі» (АДГ), прайшлі па Берліне ад Цэнтральнага вакзала да Брандэнбургскіх варот. Пратэстоўцы неслі ў руках германскія сцягі і плакаты з крытыкай міграцыйнай палітыкі ўрада.



Пры гэтым яшчэ 20 тысяч чалавек выйшлі на вуліцы, каб выказаць нязгоду з лозунгамі прыхільнікаў правай партыі. Дэманстранты з гэтай групы ўстанавілі гукавое абсталяванне на адной са сцэн горада, каб уключаць гучную музыку і заглушыць выступленні мітынгоўцаў з процілеглага лагера. У горадзе было зарэгістравана па меншай меры 13 контрдэманстрацый. Усе акцыі пратэсту прайшлі ў асноўным мірна.

«Альтэрнатыва для Германіі» з'явілася ў красавіку 2013 года на фоне эканамічных праблем у еўразоне і пазыковага крызісу ў Грэцыі. Працяглы час партыю турбаваў у асноўным эканамічны парадак дня, аднак па меры паглыблення міграцыйнага крызісу ў ФРГ і ў ЕС гэтая палітычная сіла пачала нарошчваць рэйтынгі менавіта на тэме бежанцаў.

Паводле афіцыйных вынікаў выбараў у бундэстаг, якія прайшлі ў верасні 2017 года, АДГ стала трэцяй сілай у парламенце, яе падтрымалі 12,6 % выбаршчыкаў. На сённяшні дзень гэтая партыя з'яўляецца асноўным сапернікам партыі Меркель.

Па апошніх даных, членамі «Альтэрнатывы» з'яўляюцца каля 27 тысяч чалавек.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «ВАШЫ ЧЫТАЧЫ САМЫЯ АДДАНЫЯ»

### Так згадвалі сяброў нашай газеты на дні падпісчыка ў Камянцы

**Гэта мерапрыемства не першы раз праводзіць супрацоўніца раённага вузла паштовай сувязі Таццяна Сцепанюк. Яна ўмее правільна заклікаць, аргументавана растлумачыць патэнцыйнаму чытачу перавагі падпіскі на перыядычнае выданне. Ды і кліенты пошты ведаюць яе як прыветлівага, добразычлівага работніка. Аб чым, дарэчы, і сказала карэспандэнту газеты жанчына, якую Таццяна агітавала за падпіску: «Напішыце, што гэта адзін з найлепшых супрацоўнікаў нашай пошты». Што мы з задавальненнем і робім.**



Таццяна СЦЕПАНЮК (справа) з кліентам на дні падпісчыка.

А начальнік РУПС Марына Цэвялюк расказала аб некаторых даўніх сябрах нашай газеты: «Падпісчыкі «Звязды» найбольш пастаянныя і адданыя. Яны не мяняюць сваіх прыярытэтаў шмат гадоў. Адны маюць звычку падпісвацца адразу на квартал, іншыя працягваюць падпіску кожны месяц, але мы ведаем, што яны заўсёды прыйдуць на пошту альбо паклічуць паштальёна, каб зноў атрымліваць дадому любімую газету. Вось Людміла Паляжаева нядаўна прыйшла працаваць на пошту ў Навіцкавічы і адразу падпісалася на «Звязду», — расказвае далей Марына Міхайлаўна, — гэта новы падпісчык. Ёсць там і даўні, адданы — Тамара Ігнацюк».

СТАР. 3

■ Парламенцкі дзённік

# ТУРЫЗМ, ГАНДАЛЬ І ЎКЛАД У СТАБІЛЬНАСЦЬ

**Працоўны панядзелак у Савеце Рэспублікі пачаўся з сустрэчы Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, з дэлегацыяй групы сяброўства «Балгарыя — Беларусь» Народнага сходу Балгарыі на чале з яе кіраўніком Васілам АНТОНАВЫМ. Бакі абмеркавалі ключавыя моманты ў супрацоўніцтве.**

За лета ў сярэднім 80 тысяч беларусаў адпачываюць на балгарскіх курортах. Міхаіл Мяснікові адзначыў актывізацыю турызму. На яго думку, гэты напрамак будзе развівацца і далей, у тым ліку за кошт таго, што няма істотнага моўнага бар'еру, ды і менталітэт у двух народаў падобны.

Акрамя таго, старшыня Савета Рэспублікі звярнуў увагу, што паміж краінамі склаліся добрыя двухбаковыя адносіны, ёсць пазітыўныя зрухі ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Работа пасла Беларусі ў Балгарыі таксама мае станоўчы эфект. Аднак, на думку Міхаіла Мясніковіча, абапірацца трэба не толькі на дыпламатычны корпус, але і на супрацоўніцтва парламентарыяў. Неабходна развіваць у большай ступені рэгіянальнае ўзаемадзеянне, бо не ўсе пытанні лепш вырашаць са сталіцы. Таксама сярод галін, дзе можна павысіць узровень узаемадзеяння, старшыня Савета Рэспублікі адзначыў навуку і адукацыю.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента звярнуў увагу на Арганізацыю чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва. Беларусь у ёй выступае назіральнікам, а Балгарыя з'яўляецца адным з дванаццаці членаў. Міхаіл Мясніковіч выказаў пажаданне, каб арганізацыя была больш пазнавальная, у тым ліку па лініі парламентарыяў. «Мяркуем, што гэта таксама будзе адзін з элементаў, якія фарміруюць залог стабільнасці ў Еўропе. Мы вельмі шмат увагі аддаём фарміраванню палітыкі ўзаемнага даверу і зніжэнню напружанасці ў Еўропе», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

Дарэчы, Васіл Антонаў нагадаў, што Балгарыя ў гэтым паўгоддзі старшынствуе ў Еўрасаюзе. Візіт у Беларусь, на яго думку, замацуе ўзровень двухбаковых адносін. Акрамя таго, учора адбылася сустрэча Міхаіла Мясніковіча з прэзідэнтам Балгарскай акадэміі навук Юліянам Рэвальскі. Сёння Васіл Антонаў сустрэнецца з рабочай групай Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з парламентам Балгарыі.

# НОВАЯ СТАРОНКА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Высокую ролю Беларусі ў садзейнічанні мірнаму ўрэгуляванню канфлікту ва Украіне адзначыў дэпутат парламента Вялікабрытаніі, кіраўнік міжпартыйнай групы па Беларусі Джон Вітынгдэйл. Ён разам з дэлегацыяй наведаў нашу краіну і сустрэўся са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ.**

Гэта першы візіт парламенцкай дэлегацыі Вялікабрытаніі ў гісторыі двухбаковых адносін. У Мінск прыехалі тры дэпутаты ад кіруючай партыі і тры ад апазіцыйных. Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу, што такі візіт можа сімвалічна адкрыць новую старонку ў супрацоўніцтве, з чым пагадзілася Паўнамоцны і Надзвычайны Пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Фіёна Гіб. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў: «І сёння, і падчас работы нашых груп дружбы няма ніякіх абмежаванняў па рэгламенце і па пераліку пытанняў. Мы гатовыя абмяркоўваць усе пытанні, якія ўяўляюць узаемны інтарэс».

Таксама Міхаіл Мясніковіч нагадаў пра міжнародны форум па бяспецы ў Еўропе, які праходзіў на мінулым тыдні і дзе прынялі ўдзел прадстаўнікі 50 дзяржаў, у тым ліку Вялікабрытаніі. Спікер адзначыў, што наша краіна шмат увагі ўдзяляе фарміраванню палітыкі даверу і зніжэнню напружанасці ў свеце наогул і ў Еўропе ў прыватнасці. Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што «мы актыўна ўцягнуты ў пытанне ўрэгулявання няпростай сітуацыі ва Украіне».

Джон Вітынгдэйл канстатаваў, што пастулова ўзмацняюцца ўзаемасувязі паміж Беларуссю і Вялікабрытаніяй. У тым ліку дзякуючы намаганням нашых паслоў. Дэпутат таксама нагадаў пра ўдзел нашай краіны ў мірным ўрэгуляванні сітуацыі ў Нагорным Карабаху. Акрамя таго, парламентарый звярнуў увагу на тое, што Вялікабрытанія прыняла рашэнне выходзіць з ЕС, таму зараз асаблівая ўвага аддаецца ўзмацненню як палітычных, так і эканамічных узаемасувязяў з краінамі па-за Еўрасаюзам.

**Алег РУМО, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з парламентам Вялікабрытаніі,** нагадаў, што групы дружбы ў парламентах былі заснаваны ў мінулым годзе. І летась падчас першай сустрэчы ў Лондане была дамоўленасць працягваць гэтыя кантакты. Алег Румо спадзяецца, што падчас візіту бакі намецяць пытанні, над якімі будуць працаваць у далейшым. У тым ліку чакаецца больш актыўнае супрацоўніцтва і паміж бізнесамі, і ў сацыяльных праектах.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■ Блізкая ўлада

# РАЗАБРАЦЦА І ДАПАМАГЧЫ



**Зваротаў і скаргаў у Адміністрацыю Прэзідэнта і Мінаблвыканкам апошнім часам стала менш. Аб гэтым паведаміў памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ падчас прыёму грамадзян у Старых Дарогах.**

Ігар Уладзіміравіч лічыць гэта вынікам больш якаснага вырашэння праблем жыхароў мясцовай уладай. Ён адзначыў: кожны выезд у рэгіёны дазваляе яму бачыць, як на месцах рэагуюць на звароты грамадзян. «А пры неабходнасці я наведваю тую вуліцу, дом, адкуль прыйшоў чалавек, каб упэўніцца ў тым, што мне расказалі», — дадаў Ігар Яўсееў. Па яго словах, людзі звяртаюцца па дапамогу па розных пытаннях. Цяпер, напрыклад, актуальная тэма летняга аздараўлення дзяцей. Бацькі цікавяцца, як атрымаць пуцёўку, хто можа часткова кампенсаваць яе кошт.

Усяго ж на прыём да Ігара Яўсеева прыйшло адзінаццаць чалавек. Да памочніка Прэзідэнта звярталіся не толькі жыхары Старадарожскага раёна, але і іншых рэгіёнаў вобласці. Жыхарка Барысава прасіла пасадзейнічаць ва ўладкаванні дарог у прыватным жылым сектары. Ігар Яўсееў паабяцаў разабрацца ў сітуацыі з выездам на месца і даць адказ.

Заяўнікаў таксама хвалявалі праблемы, што датычацца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, рамонту жылых дамоў, добраўпарадкавання вуліц і дарог, арэнды зямлі. Разбірацца Ігару Яўсееву давялося і з даволі нестандартнай сітуацыяй — мор пчол зафіксаваны на пасецы ў адной з вёсак Лагойскага раёна. Гаспадар абвінавачвае ў гэтым прыватнае прадпрыемства, якое рабіла хімічную апрацоўку пасеваў азімага рапсу. Па інструкцыі падчас гэтых работ мужчына павінен быў вывезці пасеку ў бяспечнае месца або ізаляваць пчол у вуллі. Разам з тым спецыялісты, якія праводзілі праверку, сцвярджаюць, што пчолы загінулі ў выніку хваробы, паколькі пасека знаходзіцца ў нездавальняючым санітарным стане.

Ніна Георгіеўна звярнулася з просьбай забяспечыць яе састарэлага бацьку палівам. Мужчына жыве адзін у вёсцы Старыя Фалічы. Ён інвалід і ветэран вайны. Ігар Яўсееў адзначыў, што паважанаму і заслужанаму чалавеку неабходна дапамагчы: удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны засталося мала. «Ільготныя» дровы гаспадару прывязуць на наступным тыдні.

Жанна Мікалаеўна з Чэрвеня прыйшла прасіць за сваю маці — індывідуальнага прадпрымальніка. Справа ў тым, што Чэрвеньскім райвыканкамам ёй быў прадоўжаны дагавор арэнды зямельнага ўчастка з заключэннем дадатковага пагаднення. Не пазней за тры месяцы з дня прыняцця рашэння жанчына павінна была зарэгістраваць дакумент у агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Але не зрабіла гэтага, і, па сутнасці, тэрмін арэнды скончыўся. Паводле заканадаўства райвыканкам мае права выставіць зямлю на аўкцыён. Што датычыцца гандлёвага павільёна, то ўласніца атрымала прадпісанне знесці яго да 1 чэрвеня. Ігар Яўсееў звязаўся са старшынёй Чэрвеньскага райвыканкама: «Гэта не такая вялікая правіннасць, — сказаў ён. — Трэба даць магчымасць людзям прадоўжыць бізнес. Тым больш што яны спраўна плацілі падаткі».

Па многіх пытаннях памочнік Прэзідэнта разабраўся ў ходзе прыёму. Тыя, што патрабуюць дадатковага вывучэння, узятыя на кантроль.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Бізнес

# ІНВЕСТЫЦЫІ ПРЫНОСЯЦЬ ПЛЁН

**Дзевяць інвестыцыйных праектаў коштам больш за $480 млн падпісана падчас эканамічнага форуму ў Гомелі.**

Падпісаны інвестыцыйны дагавор наконт будаўніцтва гандлёва-сэрвіснага цэнтра ў Гомелі. Пратаколамі аб намерах прадугледжана рэалізацыя будаўніцтва смеццеперапрацоўчых заводаў цвёрдых камунальных адходаў у Гомельскім, Жлобінскім і Мазырскім раёнах, стварэнне ў абласным цэнтры вытворчасці артапедычных і траўматалагічных імплантаў, арганізацыя мяса-каўбаснай вытворчасці ў Буда-Кашалёўскім раёне. Таксама запланавана будаўніцтва завода па вытворчасці прафіляваных лістоў рознай канфігурацыі на тэрыторыі СЭЗ «Гомель-Ратон», гандлёвага цэнтра ў Петрыкаве, гандлёва-лагістычнага цэнтра на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Сярод праектаў і мадэрнізацыя ўчастка ААТ «Спартак», развіццё гандлёвай сеткі «Санта» ў рэгіёне. Рэалізацыя гэтых праектаў дазволіць стварыць больш за 700 рабочых месцаў.

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка падкрэсліў, што ў краіне створаны ўсе ўмовы для развіцця інавацый і прыцягнення інвестыцый:

— Увесь час удасканальваецца заканадаўчая база, вызначаны шэраг прэферэнцый, працуюць свабодныя эканамічныя зоны, Парк высокіх тэхналогій. Беларусь з'яўляецца выдатнай пляцоўкай для выхаду замежных кампаній-інвестараў на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік адзначыў, што развіццё знешнеэканамічных сувязяў і ўсталяванне кантактаў з інвестарамі — сярод прыярытэтных кірункаў дзейнасці мясцовых органаў улады:

— За гады існавання форум набыў статус ключавога мерапрыемства года з маштабнай прэзентацыяй інвестыцыйных магчымасцяў вобласці і змястоўнай дыскусіяй па пытаннях рэгіянальнага развіцця, стаў пляцоўкай інвестыцыйных ідэй для існуючых і патэнцыйных партнёраў. Сёння Гомельская вобласць як частка тэрыторыі рэспублікі ўяўляе сабой сукупнасць самых розных прэферэнцыяльных рэжымаў, у рамках якіх інвестарам даюцца падатковыя, мытныя палёгкі і іншыя перавагі для стварэння і паспяховага вядзення бізнесу.

У межах эканамічнага форуму старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік і намеснік старшыні Чарнігаўскай абласной дзяржаўнай адміністрацыі Наталля Раманава падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі. Яго важнымі пунктамі сталі сумесныя праекты ў сферы сярэдняга і малога бізнесу, а таксама цікавы праект «Дняпроўскі паром», які накіраваны на развіццё турызму.

Сёлетні XV па ліку Гомельскі эканамічны форум сабраў удзельнікаў з 32 краін, сярод якіх Германія, Кітай, Ізраіль, Італія, Грузія, Расія, Фінляндыя, Чэхія, Нігерыя, Польшча, Румынія, Сербія...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Здарэнне

# Чаго не падзялілі?

## На беразе ракі ў Лунінецкім раёне адбылася масавая бойка

**Зараз праваахоўныя органы высвятляюць акалічнасці здарэння, многія ўдзельнікі якога пацярпелі. На жаль, абышлося не толькі гузакамі. Цела аднаго чалавека знайшлі паблізу. Заведзена крымінальная справа.**

У вёсцы Дрэбск у суботу вечарам адпачывалі дзве кампаніі, адна — з вясковых маладых людзей, другая — з гарадскіх. Паміж імі здарылася нейкае непаразуменне, адным словам, гарадскія выклікалі падмогу. І ў адзінаццаць вечара з горада ў вёску пад'ехалі яшчэ хлопцы на машынах з бітамі. У ход пайшлі металічная труба, малаток, балончык з пярцовым газам. Біліся, пакуль не прыехала міліцыя, якую выклікалі мясцовыя жыхары. Потым многім удзельнікам бойкі давялося звяртацца па медыцынскую дапамогу. А назаўтра каля рэчкі знайшлі цела 32-гадовага жыхара Мурманска, які прыехаў на адпачынак да бабулі. Мясцовыя кажуць, што ён таксама біўся.

Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік СК па Брэсцкай вобласці Дзмітрый ІВАНЮК, відавочных прыкмет гвалтоўнай смерці на целе расіяніна няма, больш дакладна скажа толькі экспертыза.

Зараз вядзецца следства. Дзясятак удзельнікаў начной бойкі затрыманы. Як паведамляецца на сайце газеты «Лунінецкія навіны», усім па 19—20 гадоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Факт

# «Апошні званок» для саюзнай моладзі

**Сёння ў сталіцы адбудзецца святочная канцэртная праграма «Апошні званок» для актыву БРСМ школ сталіцы — хлопцаў і дзяўчат, якія найбольш ярка праявілі сябе на працягу навучальнага года.**

У Маладзёжным тэатры эстрады збярэцца 250 найлепшых прадстаўнікоў пярвічных арганізацый БРСМ усіх школ Мінска. Шоу-праграма «Апошні званок» — гэта яркае і незабыўнае шоу, папулярныя песні і запальныя танцы, новыя знаёмствы і віншаванні ад зорак беларускай эстрады.

Для ўдзельнікаў свята арганізатары падрыхтавалі стылізаваную фотазону «Мінск-БРСМ», інтэрактыўную пляцоўку «Мім БДУ», а таксама святочную канцэртную праграму, падчас якой гледачоў парадуюць сваімі яркімі выступленнямі папулярныя беларускія артысты: гурты «PRАвакацыя», ByCity, Las-Vegas, ансамбль «Верасы», Ян Маерс, Ганна Благава, Аляксандр Сухараў, Інга Кісялёва, Шыр, Радміла Сямёнава, шоу-праект «ДНК», балет Fusion.

28 найлепшых хлопцаў і дзяўчат, якія найбольш актыўна і ярка праявілі сябе ў дзейнасці Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі на працягу гэтага навучальнага года, атрымаюць граматы і памятныя падарункі ад Мінскай гарадской арганізацыі ГА «БРСМ».

# Зноў мядзведзь на ўзбочыне

**Міліцыя прагнала мядзведзя з трасы ў Бярэзінскім раёне, паведамілі ва УУС Мінскага аблвыканкама.**

Здарэнне адбылося ўначы на 128-м кіламетры аўтадарогі Мінск — Магілёў. Участковы інспектар Анатоль Галуза і міліцыянер-кіроўца Васіль Тарасевіч вярталіся з выкліку ў РАУС, калі заўважылі на ўзбочыне мядзведзя, які бег насустрач. Буйны звер знаходзіўся на краі праезнай часткі. Магла ўзнікнуць рэальная небяспека для іншых удзельнікаў дарожнага руху. Супрацоўнікі міліцыі ўключылі маячкі, развярнуліся і вярнуліся да месца, дзе была заўважана жывёла. Мядзведзь бег далей па ўзбочыне. Для прадухілення магчымай аварыі міліцыянеры прынялі рашэнне накіраваць мядзведзя ў лес. Праваахоўнікі дадалі да маячкоў гукавыя сігналы. Гэта прымусіла звера змяніць маршрут. Спрытна пераскочыўшы агароджу раздзяляльнай паласы, мядзведзь праз некалькі секундаў схаваўся за дрэвамі на супрацьлеглым баку.

Нагадаем, што на мінулым тыдні ў сеціве з'явіўся невялікі ролік, зняты кіроўцам з салона аўтамабіля таксама пад Беразіном. На ім відаць, як мядзведзь хутка бяжыць уздоўж лесу. Калі машына параўнялася са зверам, той зірнуў на яе і збочыў да дрэў.

# Пайшла першая салодкая!

## Сёлета чакаецца добры ўраджай клубніц



**Недзе паўтара тыдні таму першыя клубніцы на сталічным Камароўскім рынку прадавалі па 12 рублёў за кілаграм. У гэтыя выхадныя каля станцый метро салодкую ягаду прапаноўвалі ўжо па 6 рублёў. Гавораць, што прагнозы сёлета на ўраджай клубніц вельмі добрыя і яна можа патаннець нават да 50 капеек за кілаграм.**

— Так, чакаем вельмі добры ўраджай (вядома, з папраўкай на «нябесную канцылярыю») і плануем вялікі аб'ём нарыхтовак, — пацвердзілі ў Лунінецкім раённым спажывецкім таварыстве. — Пры плане ў 250 тон пры спрыяльных умовах думаем нарыхтаваць 380—385 тон салодкай ягады. Праўда, закупачныя цэны на яе яшчэ не ўстаноўлены, бо клубніцы толькі пайшлі. Першыя, так званыя таварныя, ягады ў Дварцы напачатку закуплялі па 2,5—2,8 рубля за кілаграм, а сёння ўжо па 1—1,2 рубля. Так што цалкам магчымая і цана ў 50 капеек. Летась па такой цане мы прымалі клубніцы ў скрынях для дзіцячага харчавання, ягады для вінаробства ішлі па 30 капеек за кілаграм.

Апроч лунінецкіх клубніц зараз стала шмат ягады з Драгічынскага раёна, дзе яе вырошчваюць фермеры. Так што галоўнае, каб надвор'е не падвяло. Тады сапраўды будзем і з вясенне-летнім ласункам, і з прымальнымі цэнамі на яго.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# СВОЕЧАСОВА ВЫЯВІЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Беларусі, як і ў большасці развітых краін свету, на лідзіруючых пазіцыях знаходзяцца гармоназалежныя пухліны. У мужчын гэта рак прастаты, у жанчын — рак малочнай залозы. Апошнім часам на першае месца выходзіць рак тоўстай кішкі, а паколькі ён сустракаецца і ў мужчын, і ў жанчын, то яго абсалютная колькасць большая.

Каб своечасова выявіць самыя распаўсюджаныя злаякасныя новаўтварэнні, у Беларусі з 2007 года пачалі весці даследаванні, а з 2016-га шырока ўкаранілі скрынінгавыя праграмы. Яны дазваляюць выявіць рак чатырох лакалізацый: малочнай залозы, шыйкі маткі, прастаты і тоўстай кішкі. Прычым зрабіць гэта на самых ранніх стадыях, калі пацыент не адчувае ніякіх сімптомаў. Такі скрынінг — гэта абследаванне ўсіх здаровых людзей пэўных узроставых катэгорый, так званых груп рызыкі. Ужо летась яно прынесла свае вынікі: рак выяўлены ў 1,5 тысячы чалавек, якія лічылі сябе цалкам здаровымі і звярталіся да ўрача на прафілактычны агляд ці з іншымі праблемамі. У большасці з іх — пухліны на 1—2-й стадыях, і прагнозы ўрачоў для такіх пацыентаў аптымістычныя.

Скрынінг раку шыйкі маткі вядзецца ў нашай краіне з 70-х гадоў мінулага стагоддзя, праўда, з таго часу тэхналогіі істотна змяніліся. Сёння ва ўсёй краіне адбываецца пераход на так званую вадкасную цыталогію. Сучаснае абсталяванне для гэтага даследавання з'явілася ва ўсіх абласных цэнтрах. Самі пацыенткі розніцы не адчуюць — гінеколаг, як і раней, бярэ мазок. Трэба адзначыць, што рак шыйкі маткі ў апошнія гады «памаладзеў», бо дзяўчаты раней пачынаюць палавое жыццё. Лічыцца, што захворванне выклікае вірус папіломы чалавека, і дзесяці гадоў пасля інфіцыравання дастаткова для развіцця злаякаснага новаўтварэння. Таму злаякасная пухліна можа ўзнікнуць ужо ў 22—24 гады. Праўда, здараецца такое нячаста. Сёння скрынінгавая праграма па раку гэтай лакалізацыі ахоплівае жанчын ва ўзросце ад 30 да 60 гадоў. Раз на год трэба з'яўляцца на прафілактычны агляд да гінеколага, які возьме неабходныя аналізы.

На рак малочнай залозы жанчын абследуюць з 50 да 70 гадоў. Раз на два гады робіцца рэнтген-мамаграфія. У больш раннім узросце гэта даследаванне неінфарматыўнае з-за высокай шчыльнасці малочных залоз. Таму больш маладым жанчынам урачы рэкамендуюць ультрагукавую дыягностыку. Пасля 70 гадоў, калі да гэтага не выяўлялася адхіленняў, мамаграфію рабіць ужо немэтазгодна, бо новаўтварэнне калі і з'явілася, то развіваецца марудна і, як правіла, не вядзе да сур'ёзных праблем.

Скрынінгам раку прастаты сёння ў нашай краіне ахоплена ўзроставая група мужчын ад 50 да 65 гадоў. Раз на два гады яны здаюць аналіз крыві на ПСА (прастатспецыфічны антыген). З часам, дарэчы, плануецца такое абследаванне распаўсюдзіць на больш маладых мужчын — з 45 гадоў.

Для выяўлення раку тоўстай кішкі выкарыстоўваецца два метады дыягностыкі. Найбольш дакладны — татальная каланаскапія пад анестэзіяй з выдаленнем паліпаў. Яна робіцца адзін раз на дзесяць гадоў, і пачынаць трэба з 50-гадовага ўзросту. Такім чынам можна папярэдзіць 80 % пухлін. Але гэта складаны метад дыягностыкі, і не ўсе пакуль выказваюць жаданне яго прайсці. Ёсць іншы — даследаванне калу на схаваную кроў. Ён не такі дакладны, але калі кроў выяўляецца, пацыента накіроўваюць на татальную каланаскапію.

— Сёння ў нашай краіне скрынінгам раку прастаты, напрыклад, ахоплена 40 % мужчын, раку малочнай залозы — 20 % жанчын, — заўважае Сяргей Красны. — Невялікія, здавалася б, лічбы, але ўлічваючы, што праграмы дзейнічаюць усяго два гады, гэта выдатны вынік. Скрынінг раку тоўстай кішкі найбольш складаны і пакуль ахоплівае 2,5 % людзей.

У найбліжэйшыя гады беларускія медыкі і навукоўцы правядуць даследаванні па стварэнні праграм скрынінгу раку лёгкага і страўніка. На рак лёгкага плануецца абследаваць мужчын пасля 50 гадоў, якія маюць 15-гадовы і большы стаж курэння. Пры выяўленні раку страўніка пацыенты будуць здаваць аналіз крыві на бактэрыю хелікабактар пілары. Пасля па паказаннях будзе прызначацца гастраскапія з біяпсіяй.

**Алена КРАВЕЦ.**



# СКРЫНІНГ НА ВАРЦЕ ЖАНОЧАГА ЗДАРОЎЯ

**Раннія стадыі анкалагічных захворванняў дазволіць выяўляць рэалізацыя беларуска-італьянскага праекта па скрынінгу раку шыйкі маткі па метадзе Папанікалаў (Пап-тэст).**

Грамадская арганізацыя «Беларускі саюз жанчын» падтрымала гуманітарны праект, які рэалізуецца сумесна з італьянскім бокам на базе гомельскага РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека. Цяпер гаворка ідзе пра чатыры віды скрынінгу: раку прастаты, коларэктальнага раку, раку малочнай залозы, раку шыйкі маткі.

— Што да скрынінгу раку шыйкі маткі, то існуе некалькі магчымасцяў яго правядзення, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы Міністэрства аховы здароўя Алена БАГДАН.** — Адзін з іх — Пап-тэст, які праводзіцца ў Гомельскай вобласці. За некалькі гадоў мы вызначым яго эфектыўнасць і будзе прынята рашэнне аб тым, перавесці яго на ўсю рэспубліку, ці на ўсю Гомельскую вобласць, ці дапаўняць іншымі відамі скрынінгу.

Прафесар Фларэнційскага дзяржаўнага ўніверсітэта Нікола Камода дадаў, што рэалізацыя праекта ўключае некалькі этапаў. Першы — гэта адукацыйная падрыхтоўка медыцынскіх спецыялістаў рэспубліканскай установы: яны прайшлі навучанне ў Італіі. Другі этап прадугледжваў пастаўку ў Беларусь чатырох кольпаскопаў для правядзення абследаванняў. Трэці — непасрэдна выкананне 14 тысяч Пап-тэстаў сярод жанчын. Дарэчы, Пап-тэст дазваляе выяўляць захворванне на першай стадыі на клетачным узроўні. У Італіі ўжо больш за 30 гадоў жаночае насельніцтва праходзіць абавязковае бясплатнае абследаванне, і за гэты час атрымалася дасягнуць станоўчых вынікаў. Па словах дырэктара РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека Аляксандра Ражко, на Гомельшчыне скрынінг па метадзе Папанікалаў правядуць сярод жанчын Хойніцкага, Чачэрскага, Веткаўскага і Добрушскага раёнаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| **Продавец** | Несвижское РАЙПО, Минская обл., г. Несвиж, ул.Советская, 5/1 | |
| **Предмет аукциона** | | |
| **Продаже на аукционе одним лотом подлежат объекты недвижимого имущества, расположенные по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Сновская** | | |
| **Наименование, общая площадь, инвентарный номер** | **Назначение** | **№ дома** |
| **Здание пункта шиномонтажа**, общ. пл. **95,9 кв. м**, инв. номер 621/С-25213 | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | 4/1 |
| **Гараж**, общ. пл. **874,9 кв. м**, инв. номер 621/С-20772 | Здание специализированное автомобильного транспорта | 4/2 |
| **Контора автобазы**, общ. пл. **377,2 кв. м**, инв. номер 621/С-20773 | Здание административно-хозяйственное | 4 |
| **Составные части и принадлежности** | Целое одноэтажное кирпичное здание конторы автобазы с подвалом, двумя навесами, теневым навесом, крыльцом, учебным классом, пристройкой к учебному классу, мойкой, складом ГСМ, заправочной, щитовой, тремя уборными, водомером, воротами, калиткой, тремя покрытиями, двумя ограждениями | |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 624250100001004598, общей площадью 1,7707 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений автобазы | |
| **Обременения** | Частичная аренда. Контора автобазы имеет обременение в виде обременения в пользу ОАО «Белагропромбанк» (ипотека). Подробная информация размещена на сайте организатора аукциона www.cpo.by | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 359 596,66 бел. руб.** | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после согласования отчуждения предмета аукциона с ОАО «Белагропромбанк», в связи с наличием обременения в пользу ОАО «Белагропромбанк» (ипотека) | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **29.06.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **27.06.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** | |

**УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 05.07.2018 г. по продаже имущества, принадлежащего Малежик Д. Г.**

Легковой хэтчбек «FIAT MULTIPLA»,1999 г. в., дизель, МКПП, Кузов: ZFA18600002024949, начальной стоимостью 1 680 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606

Утерянный диплом УО «МГПТК строителей им. В. Г. Каменского» на имя Клепацкого Ивана Михайловича считать недействительным.

■ Дзень падпісчыка

# «ЗВЯЗДА» З ВОДАРАМ СЫРУ

**Газета далучылася да слаўгарадскага фестывалю «Гаспадарчы сыр» і разам з поштай прапанавала гасцям свята акрамя падпіскі на любімую газету яшчэ і эксклюзіўныя падарункі.**

Гастранамічны фестываль, які прайшоў у Слаўгарадзе сёмы раз, сабраў шмат прыхільнікаў усяго народнага і самабытнага. Газета «Звязда» цудоўна дапоўніла гэты фармат. І чытацкая аўдыторыя выдання пашырылася яшчэ на некалькі чалавек.

Наша падпісчыца Раіса Лысянкова атрымала ў падарунак ад рэдакцыі эксклюзіўны кубак — будзе спалучаць прыемнае з карысным: піць гарбату і знаёміцца з навінамі са свежага нумара «Звязды». Прызналася, што газету на роднай мове з задавальненнем чытае яе муж. А карысныя звяздоўскія парады яны разам выкарыстоўваюць у сябе на прысядзібным участку. Яшчэ адна наша чытачка Наталля Ганчарова стала ўладальніцай фірменнай кепкі. Абяцае, што, калі паедзе на курорт, будзе рэкламаваць наша выданне і там.

| № п/п | Полное и сокращенное (в скобках) наименование юридического лица, фамилия и инициалы физического лица | Место нахождения, место жительства | Фактическое место нахождения, место жительства | Основной вид деятельности юридического лица, дата рождения физического лица | Основание оказания существенного влияния | Дата наступления основания оказания существенного влияния | Удельный вес голосов в процентах | Доля участия в уставном фонде в процентах | Информация о вхождении юридического лица в состав иной банковской группы, банковского холдинга | Основание невключения информации о деятельности |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 1 | Головная организация и участники банковского холдинга | | | | | | | | | |
| 1.1 | Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк») | 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3 | 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3 | деятельность коммерческих банков | | | | | | |
| 1.2 | Открытое акционерное общество «Агролизинг» (ОАО «Агролизинг») | 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31 | 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31 | финансовый лизинг | 1.1ОЕС | 20.07.2006 (1.1ОЕС) | 92,33 (1.1ОЕС) | 92,33 (1.1ОЕС) | нет | |
| 1.3 | Открытое акционерное общество «Озерицкий-Агро» (ОАО «Озерицкий-Агро») | 222215, Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, агрогородок Слобода, ул. Центральная, 7 | 222215, Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, агрогородок Слобода, ул. Центральная, 7 | производство, переработка, сбыт сельскохозяйственной продукции | 1.1ОЕС | 16.12.2016 (1.1ОЕС) | 99,7 (1.1ОЕС) | 99,7 (1.1ОЕС) | нет | |
| 1.4 | Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт» (Унитарное предприятие «Агробизнесконсалт») | 220123, г. Минск, ул. Веры Хоружей, 22, офис 1703 | 220123, г. Минск, ул. Веры Хоружей, 22, офис 1703 | консультирование по вопросам коммерческой деятельности и управления | 1.1Н | 19.02.2008 (1.1Н) | | 100 (1.1Н) | нет | «А» |
| 1.5 | Открытое акционерное общество «Туровщина» (ОАО «Туровщина») | 247991, Гомельская область, Житковичский район, деревня Озераны, ул. Молодежная, 1 | 247980, Гомельская область, Житковичский район, г. Туров, ул. Ленинская, 152 | сельское хозяйство | 1.1ОЕС | 20.08.2009 (1.1ОЕ) 20.11.2009 (1.1С) | 94,98 (1.1ОЕС) | 94,98 (1.1ОЕС) | нет | |
| 2 | Лица, передавшие право на участие в управлении участником банковского холдинга, указанным в графе 2 пункта 1 настоящего приложения | | | | | | | | | |
| 2.1 | | | | | | | | | | |
| 3 | Индивидуальный предприниматель (управляющий) | | | | | | | | | |
| 3.1 | | | | | | | | | | |

ФБК
ФБК БЕЛ
PKF Accountants & business advisers

Республика Беларусь, 220090, Минск, тракт Логойский, 22А, пом. 201
Тел./факс +375 (17) 262 52 23
E-mail fbk@fbk.by, www.fbk.by
Исх. № 05-01/61 от 11 мая 2018 г.

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО СОКРАЩЕННОЙ ГОДОВОЙ КОНСОЛИДИРОВАННОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ

**Господину Лысюку Анатолию Анатольевичу** Председателю Правления ОАО «Белагропромбанк»

**Акционерам, Наблюдательному Совету и Правлению** ОАО «Белагропромбанк»

***ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО СОКРАЩЕННОЙ ГОДОВОЙ КОНСОЛИДИРОВАННОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ***

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит сокращенной годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее – сокращенная годовая консолидированная финансовая отчетность) открытого акционерного общества «Белагропромбанк» (далее – ОАО «Белагропромбанк», Банк) (Республика Беларусь, 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100693551) и его дочерних предприятий (далее – «Банковский холдинг»), состоящей из консолидированного бухгалтерского баланса на 1 января 2018 года, консолидированного отчета о прибылях и убытках; консолидированного отчета об изменении собственного капитала; консолидированного отчета о движении денежных средств за 2017 год.

Сокращенная годовая консолидированная финансовая отчетность составлена на основании годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности Банковского холдинга (далее – годовая консолидированная финансовая отчетность), в результате аудита которой нами выражено аудиторское мнение без оговорок. Сокращенная годовая консолидированная финансовая отчетность не включает примечания, в которых раскрывается дополнительная информация, необходимая для правильного и полного понимания данных годовой консолидированной финансовой отчетности.

По нашему мнению, прилагаемая сокращенная годовая консолидированная финансовая отчетность во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Белагропромбанк» и его дочерних предприятий по состоянию на 1 января 2018 года финансовые результаты их деятельности и изменение их финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2017 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой консолидированной финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита годовой консолидированной финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте аудита годовой консолидированной финансовой отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этих вопросах.

Статья «Кредиты клиентам» консолидированного бухгалтерского баланса

В связи со значимостью кредитов клиентам, а также в связи с присущей им неопределенностью их погашения расчет резерва на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе, считается одним из ключевых вопросов аудита.

Существенные суждения необходимы для классификации активов, подверженных кредитному риску и оценки способности кредитополучателя исполнить свои обязательства перед Банком и его дочерними предприятиями, включая оценку качества и достаточности обеспечения.

В основу классификации кредитной задолженности по группам риска положены требования Инструкции о порядке формирования и использования банками, открытым акционерным обществом «Банк развития» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе от 28.09.2006 №138 и других актов законодательства.

Примечание 5.1.6, включенное в годовую консолидированную финансовую отчетность, содержит информацию о сформированных резервах на покрытие возможных убытков по кредитам. Примечание 9.3.2, включенное в годовую финансовую отчетность, содержит информацию о предоставленном кредитополучателями обеспечении, снижающем уровень кредитного риска.

В ходе наших аудиторских процедур мы рассмотрели и оценили методологию Банковского холдинга, используемую при классификации кредитной задолженности по группам риска.

Выполненные нами аудиторские процедуры также включали проверку на выборочной основе своевременности выявления признаков негативной информации и финансовой неустойчивости кредитополучателей.

Мы протестировали (на выборочной основе) оценку способности кредитополучателей исполнить свои обязательства перед Банком и его дочерними предприятиями, а также оценку качества и достаточности обеспечения.

Мы протестировали (на выборочной основе) достоверность проведенной Банком классификации кредитной задолженности по группам риска, полноту и своевременность формирования резервов на покрытие возможных убытков по кредитам и сформировали свое собственное суждение в отношении того, является ли такая классификация надлежащей.

Мы также проанализировали соответствие информации в отношении резерва на покрытие возможных убытков по активам, раскрываемой в годовой консолидированной финансовой отчетности, применимым требованиям законодательства.

**Прочие вопросы**

Аудит годовой консолидированной финансовой отчетности Банковского холдинга ОАО «Белагропромбанк» за 2016 год был проведен другой аудиторской организацией, которая выразила немодифицированное аудиторское мнение о данной отчетности в аудиторском заключении от 10 мая 2017 года.

**Обязанности аудируемого лица по подготовке годовой консолидированной финансовой отчетности**

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой консолидированной финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки годовой консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой консолидированной финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в годовой консолидированной финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой консолидированной финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая консолидированная финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей годовой консолидированной финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений годовой консолидированной финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;
- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в годовой консолидированной финансовой отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в годовой консолидированной финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление годовой консолидированной финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли годовая консолидированная финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Директор ООО «ФБК-Бел» А.Г. Ренейский

Аудитор, возглавлявший аудит Р.В. Кирслите

**Информация об аудиторской организации:**

Общество с ограниченной ответственностью «ФБК-Бел» (ООО «ФБК-Бел»);
Место нахождения: Республика Беларусь, 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22А, пом. 201;
Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Минским горисполкомом 6 февраля 2009 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690398039;
УНП 690398039.

Дата подписания аудиторского заключения 11 мая 2018 г.

■ Кніжная паліца

# ПРА ШТО МАЎЧАЎ ЧАС

## Сакрэтныя дакументы раскрыты ў выданні пра Кірылу Мазурава

**У выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» свет пабачыў эксклюзіўны праект — кніга «Кірыла Мазураў. Пра што маўчаў час». Яе аўтарам з'яўляецца пісьменніца, кандыдат гістарычных навук Наталля Голубева. Навуковым кіраўніком выступіла прафесар з Масквы, доктар гістарычных навук Наталля Капітонава.**

Ёсць меркаванне, што пра савецкую эпоху і яе лідараў сказана шмат, можа, амаль усё. Усё гэта ідэалагізаваная, палітызаваная, ангажаваная гісторыя... Новы аўтарскі погляд на падзеі XX стагоддзя прадстаўлены ў кнізе пра Кірылу Мазурава.

Гэта той выпадак, калі на падставе шырокай даследчай базы, не вядомых раней дакументаў, якія доўгі час захоўваліся ў архівах пад грыфам «Зусім сакрэтна», «Асаблівы сектар», асабістых дзённікавых запісаў і нясконачаных успамінаў Кірылы Мазурава пераасэнсоўваецца час, у які ён жыў і працаваў, даецца аўтарскі погляд на падзеі тых часоў, — халодная вайна, Чэхаславакія, Афганістан, смелыя эканамічныя рэформы ў СССР, якія ўвайшлі ў гісторыю як «касыгінскія», у рэалізацыі якіх Мазураў прымаў непасрэдны ўдзел.

У кнізе прадстаўлены дакументы важных палітычных падзей у СССР, не адрэдагаваныя для друку стэнаграмы, зробленыя непасрэдна ў час работы партыйных пленумаў і з'ездаў, пасяджэнняў палітбюро ЦК КПСС, у прыватнасці ліпеньскага 1957 года пленума ЦК КПСС з асуджэннем антыпартыйнай групоўкі Молатава, Малянкова, Кагановіча. Нядаўна рассакрэчаны дзённік дзейнасці ЦК КП(б) Беларусі (пачаты 22 чэрвеня 1941 года, скончаны 19 жніўня 1941 года) дазваляе даведацца, як рэальна была арганізавана работа вышэйшага кіраўніцтва рэспублікі ў самыя драматычныя першыя дні вайны. Даследаваны дзённік камандзіра партызанскага злучэння Васіля Каржа ваеннага перыяду. Ён і сёння захоўваецца ў архіве. Не заўсёды зручная праўда стала падставай не публікаваць раней гэтыя дзённікавыя нататкі Каржа.




Запіс шчырай размовы Кірылы Мазурава з Панцеляймонам Панамарэнкам дае магчымасць даведацца пра тыя падзеі, якія раней выклікалі дадумванні і розныя меркаванні, а менавіта: як няпроста стварыўся Цэнтральны штаб партызанскага руху, там расказваецца пра Армію Краёву, пра жорсткае супрацьстаянне з Хрушчовым па тэрытарыяльным пытанні, у прыватнасці пра перадачу часткі Белавежскай пушчы ўкраінцам, пра рэпрэсіі, пра нежаданне многіх кіраўнікоў прызнаваць існаванне Мінскага падполля і іншае.

Шмат якія недасяжныя раней для даследаванняў дакументы раскажуць пра міжнародную дзейнасць Мазурава. Таемныя і афіцыйныя сустрэчы з сусветнымі лідарамі, сяброўскія гутаркі з імі на адпачынку і працоўныя паездкі, многія з якіх не афішаваліся, дапамагаюць зразумець, наколькі складанай была абстаноўка ў свеце і якім коштам падтрымлівалася стабільнасць. Многія хітраспляценні, да якіх звярталіся ў міжнароднай палітыцы, часам нагадваюць дэтэктыў.

Дакументы, успаміны, асабістыя запісы... Яны рэальныя сведкі не толькі таго, як ішла гісторыя XX стагоддзя, але і таго, што адбывалася ў асяродку партыйнай эліты. Не ўсё гладка складвалася ў беларускага кіраўніцтва з цэнтрам: нязгода з хрушчоўскімі рэформамі часта прыводзіла да супрацьстаяння цэнтра і краіны, непакорнага Мазурава і кіраўніцтва Саветаў. Ён мог сказаць «не» і не падпарадкоўвацца рашэнням зверху, калі гэта не адпавядала інтарэсам Беларусі. Раней невядомыя дакументы дапамагаюць зразумець, наколькі няпростым быў канфлікт спачатку з Хрушчовым, а потым з Брэжневым, асабліва ва ўмовах павышанай увагі да маладога энергічнага кіраўніка з боку заходніх дзяржаў, якія бачылі ў ім кандыдатуру пераемніка для кіравання ўсёй вялікай краінай.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Брэнд краіны

# ВАНДРОЎКА Ў ЭТНАКАЗКУ

**Стаю каля музея літаратуры і краязнаўства ў Гудзевічах, дзе слаўнае мінулае сутыкнулася з цяжарам сучаснага і — трэба ж! — яго перамагло. Знайшліся і спонсары, і праграмы развіцця, а з імі — вялікія грошы. Зрабілі рамонт, купілі еўрапейскае абсталяванне. І сёлета вясковы музей, які размяняў шосты дзясятак, прапаноўвае нам ужо якасна іншую, камфортную вандроўку ў этнаказку.**

**Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў, Іван Мележ, Пімен Панчанка ў свой час атрымалі гудзевіцкія паясы і закладкі ў падарунак. Што і казаць! Класікі беларускай літаратуры ведалі дарогу ў гэтую старажытную вёску ў Мастоўскім раёне, што на Гродзеншчыне. Часта ступалі яны па гэтых сцежках у барвах бэзу. А сёння такая магчымасць ёсць у вас.**



### ТОП-5

Гудзевіцкі музей — гэта 10 залаў у асобным будынку і хатка, сапраўдная, перавезеная з суседняй вёскі. Гэта вялікая тэрыторыя з ляском і пляцоўкай для правядзення фэстаў і гульнявых праграм. Але найперш — багацце, адзначанае залатой пробай часу. І музею ёсць чым не проста здзівіць сучаснага ўзброенага ўсёведным інтэрнэтам госця, а ўразіць. Якія ж каштоўныя экспанаты хаваюць гэтыя сцены і што абавязкова ўвойдзе ў топ-5?

Любіце літаратуру? Калі ласка, у музейнай бібліятэцы сярод кніг XIX і пачатку XX стагоддзя — паверце і праверце — ёсць рэдкае выданне «Дудкі беларускай» Францішка Багушэвіча. А палымяным паклоннікам Уладзіміра Караткевіча будзе прыемна даведацца, што ў музеі выстаўлена аўтаручка, якой ён напісаў «Каласы пад сярпом тваім». Тут нагогул захоўваецца безліч сакрэтаў ліставання беларускай эліты, і не толькі літаратурнай. Экскурсаводы раскажуць і пра першых касманаўтаў Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка.

Многія ладзяць паломніцтва ў Гудзевічы дзеля этнаграфічнага аддзела — хаткі і рэчаў, што ў ёй знаходзяцца: качарга, рагачы, абіякі, спарыш, кацуба. Не можаце растлумачыць значэнне і паловы з гэтых слоў? Тады вам дарога ў Гудзевічы. Думаю, наведвальнікаў рассмяшаць многія гісторыі пра нетрывіяльнае выкарыстанне хатніх прадметаў. Так, чапяла — выгнутая акурат як па спіне мужчыны палка, якой жонка не толькі падымала з печы патэльню, але і выхоўвала мужа.

У топ-5 экспанатаў пачэснае месца займае падвойны дыван 1898 года — канкурэнт слуцкіх паясоў. А яшчэ — адзіны ў сваім родзе беларускамоўны глобус з віленскай гімназіі. Усяго больш за 16 тысяч прадметаў, у тым ліку рэдкая ікона. І гэта толькі малая доля музейных цікавінак, якія зберагаюць Гудзевічы, вёска, вядомая з XVI стагоддзя. Як гаворыць за шклом старажытная грамата часоў унука Ягайлы, «здаўна прыслухаючыся да царквы святое прачыстае панны нашай у Гудзевічах».

### У ПОШУКУ ГРОШАЙ

Прыслухацца да новых павеваў у справе турызму вясковы музей вырашыў сам і пачаў актыўны пошук грошай, бізнес-партнёраў і духоўных аднадумцаў. «Музей мае даўнюю гісторыю развіцця. І для свайго часу ўзнікнення, калі ў 1968-м яго адкрылі ў адным маленькім пакойчыку, — гэта было «ах». Калі ў 1984-м пад музей аддалі чатыры пакойчыкі, — гэта таксама было «ах». Было «ах», калі адкрылі дзве залы лёну і ткацтва. Калі будынкі паміж сабой злучылі, з'явіліся залы пра гісторыю вёскі, народную медыцыну. Так, усё паасобку гэта безумоўна было «ах». Але ў цэлым музей патрабаваў рэканструкцыі, бо стварыўся фрагментарна. Не было агульнага бачання экспазіцыі», — адзначае дырэктар Кацярына Басінская.

Хто шукае, а не аплаквае бедны бюджэт культурных устаноў, той знаходзіць. Актыўнасць дапамагла музею трапіць у адзін з праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі Польшча — Беларусь — Украіна. З Захаду прыйшоў новы трэнд — цікавасць да этнічнага. І музеі беларускага памежжа атрымалі шанц з разбегу ўскочыць у бурную турыстычную дзейнасць, павысіць прывабнасць трансгранічнага рэгіёна, якім заўжды былі Мастоўшчына і Гродзеншчына ў цэлым. Ці не закапаў у зямлю свой шанц гудзевіцкі музей?

### ДА СЫМОНІХІ, ДА ЛЯВОНІХІ

«З'явілася інфраструктура прыёму гасцей: зона гардэроба, сувенірная прадукцыя, санвузел. Мы ўжо банальна не папросім наведвальнікаў схадзіць у лясок, аніякага экстрыму, — жартуе дырэктар музея. — Зрабілі рамонт, рээкспазіцыю ключавых залаў, рэканструкцыю народных строяў. Апошнія мы зараз актыўна выкарыстоўваем у сваёй працы. Калі раней у музеі былі экскурсіі толькі аглядныя або тэматычныя, то цяпер платныя паслугі пашырыліся. І мы ладзім гульнявыя праграмы, модна кажучы — анімацыю».

Дзяцей вабіць праграма «У гасцях у Сымонісі і Лявоніхі», дзе можна паўдзельнічаць у конкурсах з песнямі, загадкамі, танцамі пад жывы гук. На Каляды музей калядуе, на Масленіцу запрашае на бліны з гарбатай. Тэрыторыя музея дазваляе зрабіць зоны для адпачынку, нават падтрымаць апошні піск моды — квэсты.

«Найчасцей нашы наведвальнікі — школьнікі, асабліва вучні пачатковых класаў. І для іх вандроўка, скажам, з Гродна ў Гудзевічы — гэта вялікае свята, — дзеліцца Кацярына Басінская. — Мы ж размешчаны ўбок ад цэнтральнай трасы, своеасаблівы апендыкс, як тут жартуюць мясцовыя. Таму заўжды раім узбагаціць маршрут: наведаць па дарозе музей вавёркі ў Бераставіцы, музей камянёў у Вялікіх Эйсмантах, музей Баграціёна ў Ваўкавыску. А наша анімацыя — якраз і будзе той цікавінкай, якую сучасныя дзеці вельмі хочуць».

Чакае і актуальная навінка — вытворчы турызм. Дзяцей, што ад калыскі жывуць у каменных джунглях, цікавяць прырода і вёска. Аглядныя экскурсіі па Гудзевічах, наведванне малочнатаварнай фермы і мехдвара, каб убачыць трактары і камбайны, — перспектыва ў год роднай зямлі. Гавораць, можа такая экскурсія падштурхне кагосьці, каб пераехаць у вёску працаваць?

### ГУДЗЕВІЧЫ ЗАПРАШАЮЦЬ

Практычны кірунак музея — ткацтва. 50 гадоў таму ў Гудзевічах ім пачала займацца Вера Белакоз, жонка Алеся Белакоза, стваральніка музея. Сёння для прыезджых груп ладзяцца майстар-класы. Калі ў гасцей ёсць час, тут паказваюць, як працуюць на малых і вялікіх кроснах, даюць паспрабаваць выткаць штосьці сабе на памяць.

Кожны год у другія выхадныя чэрвеня Гудзевічы запрашаюць у летнюю школу «Майстэрня падвойнага ткацтва». За тры дні ёсць чаму павучыцца і ёсць як адпачыць пад народную музыку ў добрай кампаніі. Многія едуць сюды з іншых куткоў Беларусі з начлегам. Галоўнае — папярэдзіць, бо гасцініцы ў Гудзевічах пакуль няма. Летам жа можна размясціцца ў палатках на тэрыторыі музея. Рамантыка, ці не так?

### БУМ

У 2015 годзе гродзенскі аддзел адукацыі правёў нараду, дзе прысутнічалі дырэктары школ. Выявілася, вучні часта падарожнічаюць за мяжу, як правіла ў Беласток. Калі параўноўваліся Беласток і Вільня, усё роўна выбіраўся Беласток. Прааналізаваўшы гэтую справу, аддзел адукацыі парэкамендаваў кожную пятую экскурсію ладзіць за мяжу, чатыры — рабіць па Беларусі.

«І вось ў 2015—2016 гадах у нас здарыўся бум. Экскурсіі ішлі бесперапынна. Сёлета ж турыстычны спад. І не толькі з-за варыятыўнасці рэкамендацый, але і больш жорсткіх патрабаванняў да дакументацыі. Грашовы складнік таксама не апошнюю ролю іграе», — гаворыць Кацярына Басінская. У сваю чаргу хочацца нагадаць, што білет для дзяцей у гудзевіцкі музей каштуе — увага! — 1 рубель, анімацыя — 2 рублі.

Гэта гісторыя не пра тое, што музей у Гудзевічах святкуе паўвекавы юбілей, і не пра тое, што падарожжа па роднай зямлі — гэта танна, цікава і модна. Гэта гісторыя пра тое, як вясковы музей спяшаецца за часам, асвойвае новыя тэхналогіі, пашырае паслугі, думае пра інтэрактыўнасць, запазычвае ўсё самае лепшае ад суседзяў, знаходзіць праграмы і не перастае шукаць новыя дзверы. Шукае партнёраў і сяброў, удзельнічае ў круглых сталах на базе ўніверсітэтаў. Бюджэтнасць культурных устаноў і канкурэнцыя — часта адгаворкі. Час інтэрнэту прыносіць не толькі праблемы, але і роўныя для ўсіх магчымасці.

У юбілейны год гудзевіцкі музей азіраецца з вышыні птушынага палёту на свой 50-гадовы вопыт. Радасна, што столькі часу тут гучыць чыстая родная мова. Музей застаецца вядомым не толькі на Гродзеншчыне і не толькі ў Беларусі.

**Маргарыта САДОЎСКАЯ**

■ Сваімі словамі

# (Ня)слёзы аб двух дрэвах



**Стары горад і мястэчка перадаюць нам усім прывітанні. «Як?» — спытаеце вы. Праз паштоўкі і здымкі мінулых часоў. Праз фотаальбомы, прысвечаныя розным перыядам гісторыі. Праз зборы архіўных дакументаў, што хаваюць колішнія дух і атмасферу.**

Мінск таксама часам прыемна здзіўляе тым, што нагадвае машыну часу. Неяк мне даводзілася з вышыні апошніх паверхаў глядзець на Нацыянальную акадэмію навук, праспект Незалежнасці і кінатэатр «Кастрычнік». Гэта аб'екты савецкай архітэктуры, размешчаныя зусім побач адзін з адным. Атрымліваецца абсалютна цэльная кампазіцыя. Нічога чужароднага ў ёй няма. Яна настолькі гарманічная ў сваім адзінстве, што падалося, быццам я сапраўды трапіла ў старую паштоўку. Быццам перанеслася на 50—80 гадоў назад — у той час, калі яны былі пабудаваныя. У велічных пабудовах зафіксавана гісторыя. Яе непарушны, маналітны мур.

Зусім іншую, своеасаблівую гісторыю памятаюць дрэвы, якія растуць у нашых дварах. І я б зусім не называла іх доўгажыхарамі — хутчэй даўнімі, надзейнымі суседзямі. Аднак часам даводзіцца назіраць, як яны па зусім незразумелых прычынах знікаюць са сваіх звыклых месцаў.

Неяк доўгі час даводзілася хадзіць міма двух дрэў-прыгажуноў, якія раслі ля шумнага праспекта. Яны ўдала ўпісваліся ў досыць аднастайны пейзаж, дадавалі яму свежасці і яркіх фарбаў. Але супрацоўнікі службы вырашылі ўнесці сваю «разыначку» ў навакольны краявід. Адной раніцай прыйшлі людзі ў працоўнай вопратцы і спілавалі два дрэвы. Праўда, на гэтым гісторыя не скончылася.



Паколькі я кожны дзень хадзіла той дарогай, то назірала за далейшым развіццём падзей. І ў мяне склалася ўражанне, што работнікі ЖЭСа шкадуюць аб сваім учынку — і імкнуцца схаваць яго. Яшчэ адной раніцай група мужчын — і ў касцюмах, і ў працоўнай форме — спрабавалі зацягнуць на месцы спілаў велізарныя бетонныя клумбы. Прыехала маленькая новенькая машына-пад'ёмнік — па яе ідэальным стане можна было меркаваць, толькі што набытая, — і на ёй спрабавалі перавезці велізарную клумбу. Аднак падчапіць апошнюю з дапамогай такой прылады так і не ўдалося. Клумбу абвязвалі вяроўкамі і цягнулі ўсе разам — гэта таксама не надта дапамагло. Натуральна, назіраць за імі бясконца я не стала. Але на наступны дзень заўважыла, што клумбы ўсё-такі ўсталяваныя на месцы спілаў дрэў. Хоць бы тое прыемна, што пасля стольких высілкаў мужчыны свайго дамагліся!

Яшчэ праз колькі часу клумбы аздобілі кветкамі, а невялічкія кавалачкі зямлі, што заставаліся вакол іх, старанна ўскапалі і засеялі травой. Прайшоў тыдзень ці два — і побач з бетоннымі кветнікамі з'явілася і некалькі навясных, шмат'ярусных. Мінула пару наступных тыдняў — і вакол з'явіліся прыгожыя бліскучыя парэнчы — акурат такія ж знаходзяцца непадалёк. Усё стала выглядаць быццам ідэальна. І ўжо ніхто не здагадаўся б, што калісьці на гэтых месцах раслі два дрэвы... Памяць жыве толькі на маіх фотаздымках і на нейчых паштоўках, акуратна зробленых у гэтым прыгожым месцы сталіцы.

Цікава, што ж насамрэч адбылося? Можа быць, гэта проста разыгралася мая фантазія, дамалёўваючы гісторыю спілаваных дрэў? Ці сапраўды супрацоўнікі камунальных службаў спалохаліся, зразумелі, што не варта проста так пілаваць дрэвы, і паспрабавалі схаваць зробленае? На наступную раніцу пасля гэтага спілу ў прэсе пачалі цытаваць словы кіраўніка краіны аб тым, што нельга знішчаць зялёныя насаджэнні. «Не ты садзіў гэтыя дрэвы — не табе іх спілоўваць. Паспрабуй вырасціць новае!» — гэтыя сказы сталі амаль крылатымі. Аднак зробленага ўжо не вернеш.

Два дрэвы — не такая і вялікая страта. Хоць і гэта важны акцэнт, ён быў ключавым у стварэнні зялёнага ландшафту. А што рабіць, калі паспяшаліся і высеклі цэлы парк, кіруючыся нейкімі быццам бы лепшымі мэтамі? Замаскіраваць спілы і ўсе іх зрабіць суцэльнай вялікай клумбай будзе ўжо складана. А што, калі былі знесены будынкі мінулых эпох, сапраўды прыгожыя і вартыя таго, каб застацца?.. Дзякуй богу, удалося адстаяць сталічны раён Асмалоўку. Аднак пасёлак Трактарнага завода ўжо панёс істотныя страты. Прычым адметныя будынкі зносілі проста так — «бо пустую пляцоўку больш ахвотна набудзе інвестар». Што рабіць на іх месцы, калі стане зразумелым: знеслі памылкова. Закатаць асфальтам тэрыторыю (гэта таксама немалыя грошы)? Аддаць хоць каму-небудзь і сказаць: «Зрабіце там хоць што-небудзь»?

Два спілаваныя дрэвы былі вартыя таго, каб пра іх напісаць, таму што адказнасць пачынаецца з невялікага. З аднаго кусціка, пасаджанага ў двары каля дома. І з нейчага кветніка, вытаптанага коламі машыны. З таго, каб кожны год садзіць маленькія дрэўцы на пустцы ў Каменнай Горцы. І з таго, каб дазваляць сваім дзецям іх штогод ламаць, каб быццам незнарок чапляць. Адказнасць палягае ў тым, каб знайсці спосаб і законныя абгрунтаванні, каб захаваць будынак з доўгай гісторыяй (хоць ён табе і не належыць). І ў тым, каб у адзін момант скарыстацца сваім правам на рашэнне, а не на ўласнасць — і аддаць распараджэнне аб яго зносе. Ці не?...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

Пантэон Айчыны

# БАРБАРА РАДЗІВІЛ (26.11.1523 — 08.05.1551)

Гісторыя кахання Барбары Радзівіл і вялікага князя літоўскага і польскага караля Жыгімонта Аўгуста рамантычная і драматычная. Не пяро геніяльнага драматурга, а само жыццё напісала яе сюжэт. На фоне палітычных інтрыг і амбіцыйнай барацьбы самалюбстваў каханне Барбары і Жыгімонта Аўгуста паказала, наколькі ўсё гэта нязначнае і мімалётнае ў параўнанні са светлымі і шчырымі праявамі душы. Каханне вышэйшае за ўладу, яно — даражэйшы за багацце светлы божы дар!

Сучаснікі параўноўвалі Барбару з антычнай прыгажуняй Аленай Траянскай, бо за яе ледзь не ўспыхнула вайна. Ворагі ганілі яе імя, ачарнялі яе годнасць, а пачуццё зняважалася злоснымі намовамі.

Дачка аднаго з самых багатых і ўплывовых магнатаў у Вялікім Княстве Літоўскім Юрыя Радзівіла Барбара славілася сваёй прыгажосцю, вольным характарам і чароўнай вабнасцю. Магчыма, яе лёс склаўся б інакш, каб яна рана не аўдавела. Яе муж, наваградскі ваявода Станіслаў Гаштольд, аддаваў больш увагі дзяржаўным справам і проста сваім мужчынскім інтарэсам, чым сваёй юнай жонцы (Барбары было ўсяго 14 гадоў, калі яна ў 1537 годзе пабралася шлюбам). Так што ні мужчынскай ласкі і ўвагі, ні радасцяў кахання Барбара не зведала. Смерць мужа ў 1542 годзе вызваліла Барбару ад сумнага сямейнага адзіноцтва. Пэўна, Барбары перадаўся пачуццёва-чуллівы характар яе маці Барбары Калонскай, якую падазравалі ў любоўных сувязях з каралём Жыгімонтам Казіміравічам. Вясёлая і жыццярадасная ўдава нядоўга трымала жалобу. Геранёнскі замак, дзе жыла Барбара, ахвотна наведвала маладая знаць. Ды і сама Барбара прыязджала ў Вільню на вясёлыя прыдворныя баляванні, якія ладзіў у сваім шыкоўным палацы малады вялікі князь Жыгімонт Аўгуст. Вось там яны і пазнаёміліся. Паколькі гаспадар быў жанаты, дык адкрыта праяўляць свае пачуцці да Барбары ён не мог. І мы можам толькі здагадвацца, што менавіта тады паміж імі нарадзілася каханне, мацнейшае за плёткі і перашкоды. Знайшоўшы прыдатную нагоду, Жыгімонт Аўгуст прыехаў у Геранёны, дзе пражыў некалькі тыдняў. Для апраўдання ён спасылаўся на эпідэмію, маўляў, хаваўся ад яе. Але для людзей дасведчаных было зразумела, што Жыгімонт Аўгуст, зачараваны «павабамі і пяшчотамі» Барбары, пакахаў яе і, як згадваў адзін са сведкаў, «з запалам яе пажадаў».

Смерць жонкі Эльжбеты Габсбург у 1545 годзе вызваліла Жыгімонта ад сямейных ланцугоў. Не абышлося і без зласлівых пагалосак, што вялікую княгіню атруцілі з намовы Барбары. Так чорная няслава пачала ахутваць светлы арэол, за якім неўзабаве будзе цяжка разгледзець і саму постаць жанчыны.

Здавалася, цяпер нішто не магло перашкаджаць закаханым. Барбара перабралася з Геранёнаў у Вільню і жыла ў бацькоўскім доме непадалёк ад вялікакняжацкага палаца. Па загадзе Жыгімонта Аўгуста абодва палацы злучылі крытай галерэяй, па якой ён мог наведваць сваю каханую. Не абышлося без спрыяння маці Барбары. А вось яе браты — родны Мікалай Руды і стрыечны Мікалай Чорны Радзівілы — не вельмі прыхільна глядзелі на каханне гаспадара да іх сястры. Слава гаспадарскай палюбоўніцы ганіла родавую годнасць Радзівілаў. У выніку браты падлавілі Жыгімонта Аўгуста падчас ягонага чарговага візіту да Барбары і катэгарычна запатрабавалі, каб «неславы дому их не чинил». Жыгімонт Аўгуст паабяцаў не прыходзіць да іх сястры, але не змог стрымаць свайго слова. Каханне аказалася вышэйшым і за манаршае абяцанне, і за разважлівасць, і за прыстойнасць. І калі ён зноў наведаў Барбару, дык пад ціскам Радзівілаў згадзіўся ажаніцца з ёй. Адразу ж у палацавай капліцы адбылося таемнае вянчанне. Для тагачаснага грамадства адбылося неймавернае — манарх ажаніўся са сваёй падданай, чым зняважыў не толькі свой манаршы гонар, але і высокае значэнне манархіі.

Калі на Літве змірыліся са шлюбам іх гаспадара, то ў Польшчы яго палічылі абразай. Яшчэ пры жыцці бацькі Жыгімонт Аўгуст быў выбраны польскім каралём, а таму пытанне яго жаніцьбы лічылася найважнейшай палітычнай справай. Польскія магнаты баяліся ўплыву Радзівілаў на Жыгімонта Аўгуста, іх антыпольскіх настрояў і асабліва негатыўнага стаўлення да уніі Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага. Так што гэты шлюб набыў палітычнае значэнне, Жыгімонту Аўгусту давялося перажыць шмат непрыемнасцяў і выпрабаванняў, абараняючы свой выбар. Стары кароль усё ж пагадзіўся са шлюбам сына, а вось маці каралева Бона падняла супраць Барбары ўсю Польшчу. Краіну наваднілі брудныя пасквілі, дзе Барбару называлі самымі апошнімі словамі, прадстаўляючы яе вавілонскай блудніцай. Абуралася такім выбарам будучага свайго гаспадара шляхта, інтрыгавала панства, жадаючы дамагчыся ў смуце выгад для сябе. І перад бацькамі, і перад сваімі падданымі, і перад патрабаваннямі соймаў Жыгімонт Аўгуст быў цвёрдым і не выракся сваёй жонкі.

З трывогай чакала Барбара вырашэння свайго лёсу. Ад перажыванняў яна часта траціла прытомнасць. У знерваванай жанчыны заўчасна нарадзілася нежывое дзіця. Толькі пасля смерці бацькі ў 1548 годзе Жыгімонт Аўгуст змог адкрыта ўвесці Барбару ў вялікакняжацкі палац і прылюдна назваць сваёй жонкай.

А ў Польшчы па-ранейшаму не прызнавалі шлюбу свайго караля. Жыгімонт Аўгуст гатовы быў адмовіцца ад польскай кароны і хай «у апошняй кашулі, але застацца разам са сваёй жонкай». Ён запрасіў яе ў Польшчу і з вялікай пашанай і ўрачыстасцямі прывёз у Кракаў, адкуль дэманстратыўна з'ехала каралева Бона. Затое просты народ шчыра вітаў выбранніцу свайго гаспадара, які асыпаў жонку каралеўскімі міласцямі. У сваім прывілеі ён пісаў, што жыве з «намилешою малжонкою нашою... в почтивости и милости правдивой малженской». Недругі каралеўскага шлюбу зразумелі дарэмнасць сваёй упартасці. Каханне караля было мацнейшым за іх нянавісць. Каханне надавала яму сілы для пераадольвання ўсіх перашкод да шчасця, натхняла яго да рыцарскай пачцівасці да «найяснейшай пани» свайго сэрца.



Нарэшце апазіцыя здалася і прызнала Барбару жонкай караля. Цяпер ворагі зрабіліся сябрамі і крычалі: «Хай будзе забіты той, хто яе не хоча мець за пані». Барбару ўрачыста 7 снежня 1550 года каранавалі. Аднак яна нібыта адчувала свой хуткі драматычны канец. «Да іншай кароны Пан нябесны мяне воліць. Прасіце яго за мяне, каб замяніў зямны цяжар на нябесны вянец, а мілага мужа майго пасля мяне суцешыў у жалобе». Неўзабаве Барбара, падкошаная хваробай, злягла ў ложак.

Нягледзячы на ўсе намаганні лекараў, знахароў і нават чарадзеек, здароўе пагаршалася. Падазравалі, што Барбару атруцілі па намове каралевы Боны. Няшчасны Жыгімонт Аўгуст, верачы ў выздараўленне каханай, дзень і ноч праводзіў каля яе. Перад смерцю Барбара суцяшала мужа і прасіла яго ажаніцца, каб прадоўжыць род Ягелонаў. 8 мая 1551 года на вачах у Жыгімонта Аўгуста Барбара памерла. Выконваючы яе просьбу, кароль пахаваў Барбару ў Вільні. Да канца свайго жыцця ён насіў жалобу па сваёй каханай. У яе гонар ён пабудаваў у Вільні касцёл Святой Ганны і Барбары і завяшчаў пахаваць сябе ў ім побач з Барбарай, каб смерць зноў злучыла іх у вечнасці.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

алімпіец
СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК
ЗВЯЗДА
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



# АРЭНА СУЧАСНАСЦІ І БУДУЧЫНІ

## Што ўяўляе сабой адзін з аб'ектаў II Еўрапейскіх гульняў



**«Чыжоўка-Арэна» — другая па велічыні пасля «Мінск-Арэны» лядовая пляцоўка краіны, яна была пабудавана да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года і прыняла 30 матчаў гэтага турніру, у тым ліку два чвэрцьфіналы. Комплекс падыходзіць не толькі для прафесійных спартсменаў, ён з'яўляецца выдатным месцам для актыўнага адпачынку і забаў.**

### НЕ ТОЛЬКІ ДОМ ХАКЕЯ

Шматфункцыянальны культурна-спартыўны і забаўляльны комплекс размешчаны ў маляўнічым месцы на тэрыторыі парку імя 900-годдзя Мінска. У аснове праекта архітэктара Марата Гроднікава — вобраз дзвюх кропель вады, якія перацякаюць адна ў адну: сучасны будынак са шкла і металу гарманічна ўпісваецца ў прыродны ландшафт Чыжоўскага вадасховішча.

У маштабны комплекс, пабудаваны з улікам сусветнага вопыту і стандартаў Міжнароднай федэрацыі хакея, уваходзяць вялікая арэна (агульная плошча 39 073,27 $м^2$), малая арэна (19 452 $м^2$) і злучальная зона (9 344 $м^2$), дзе знаходзіцца цэнтр адпачынку і забаў.

Вялікая арэна выкарыстоўваецца для правядзення хакейных турніраў і буйных матчаў, спаборніцтваў па фігурным катанні і шорт-трэку, пры неабходнасці трансфармуецца ў пляцоўку для гульнявых відаў спорту, адзінаборстваў, цяжкай атлетыкі і гімнастыкі, а таксама выставак, канцэртаў і шоу.

Лядовая пляцоўка (30х60 м) з бартавой сістэмай, якая плавае, спраектавана па ўзоры большасці арэн клубаў Нацыянальнай хакейнай лігі. Дзякуючы бартам, якія амартызуюцца, паніжана рызыка траўмавання гульцоў. Умяшчальнасць трыбун вялікай арэны — 8807 чалавек, акрамя таго, паміж партэрам і верхнім узроўнем знаходзяцца 43 VIP-ложы на 500 месцаў.

У вялікай арэне акрамя сямі раздзявалак і экіпіровачнага цэнтра ёсць станцыя антыдопінгавага кантролю і пункт першай дапамогі.

Малая арэна прызначана для прафесійных трэніровак і спаборніцтваў спартсменаў, а таксама масавага катання на каньках. Акрамя лядовай пляцоўкі і 15 раздзявалак, яна змяшчае аднаўленча-аздараўленчы цэнтр (з трыма саўнамі), дзве спартыўныя залы і адміністрацыйныя памяшканні.

### ШМАТФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ І СУЧАСНАСЦЬ

Афіцыйна арэна адкрылася 25 снежня 2013 года. Яна стваралася як максімальна камфортны аб'ект для спартсменаў і гасцей. Адна з архітэктурных навінак у тым, што гледачы могуць трапіць на верхні ўзровень, не праходзячы ніжні, а ўваход на трыбуны даступны з першага і чацвёртага паверхаў. Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі прадугледжаны спецыяльны ліфт.

У будынку прыменена ўнікальная сістэма кандыцыянавання: свежае паветра падаецца пад рады на трыбунах, што дазваляе захоўваць цяпло ў глядзельнай зале.

Гандбол, тэніс, валейбол, барацьба, змешаныя адзінаборствы, мастацкая гімнастыка — гэта няпоўны спіс відаў спорту, якія знаходзілі свой дом у сценах «Чыжоўка-Арэны». У 2017 годзе тут адбыўся турнір па боксе памяці заслужанага трэнера Беларусі Уладзіміра Батвінніка, які сабраў больш за сотню байцоў з васьмі краін. Нядаўна лёд быў ператвораны ў тэнісны корт і арэна ўжо стала тэніснай пляцоўкай, дзе прайшлі матчы Кубка Федэрацыі, у тым ліку фінал.

### ДЛЯ СПАРТСМЕНАЎ, ЖУРНАЛІСТАЎ І БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ БУДЗЕ ЎСЁ

Плануецца, што тут у час II Еўрапейскіх гульняў у чэрвені 2019 года пройдуць спаборніцтвы па дзюдо і каратэ. Для гэтага будуць задзейнічаны тры галоўныя пляцоўкі: вялікая, малая і ўніверсальная гульнявая зала. Апошняя, хутчэй за ўсё, стане разміначна-трэніровачнай зонай, самі спаборніцтвы адбудуцца на вялікай і малой арэнах.

Што датычыцца пунктаў грамадскага харчавання для гледачоў, то іх у комплексе дастаткова. Для балельшчыкаў Еўрапейскіх гульняў будуць працаваць больш за 20 пунктаў продажу ежы. Ёсць рэстаран на вялікай арэне і кафэ на малой. Яшчэ некалькі перасовачных пунктаў харчавання выставяць у фае. Пры неабходнасці іх колькасць можа быць павялічана.

Не адчуюць сябе абдзеленымі на Гульнях і прадстаўнікі СМІ. Да іх паслуг будзе выдзелены вялікі прэс-цэнтр больш чым на 100 пасадачных месцаў.



Так выглядае арэна падчас правядзення тэнісных паядынкаў.

# НАСУСТРАЧ ГУЛЬНЯМ

* * *

ПАД старшынствам прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова прайшло чарговае пасяджэнне Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў 2019 года ў Беларусі.

На ім былі разгледжаны пытанні падрыхтоўкі беларускіх спартсменаў да ўдзелу ў II Еўрапейскіх гульнях, выбару субпадраднай арганізацыі для правядзення цырымоній адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў. Таксама разгледжаны прапановы па экіпіроўцы спартыўнай дэлегацыі нашай краіны і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў, і іх талісманаў.

* * *

ЗАВЯРШЫЛАСЯ першая хваля гутарак на пазіцыі валанцёраў II Еўрапейскіх гульняў, якая стартавала 19 лютага.

Прадстаўнікі аддзела па рабоце з валанцёрамі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» правялі гутаркі са студэнтамі сталічных і рэгіянальных устаноў вышэйшай адукацыі. Усяго ў інтэрв'ю прыняло ўдзел больш за пяць тысяч кандыдатаў на пазіцыі добраахвотнікаў па 20 функцыянальных напрамках.

Самую вялікую цікавасць у кандыдатаў выклікаюць напрамкі, звязаныя з працай на спартыўных аб'ектах: работа са спартсменамі і гледачамі, ажыццяўленне навігацыі на арэнах.

Зараз вынікі гутарак апрацоўваюцца і заносяцца ў электронную сістэму рэгістрацыі.

У ліпені — жніўні плануецца правесці анлайн гутаркі з кандыдатамі з-за мяжы. Замежнымі грамадзянамі з 52 краін запоўнена 850 анкет. Пераважная колькасць заявак паступіла з Расіі — 628. Другое месца па колькасці заявак дзеляць Азербайджан, Украіна, Казахстан — па 31 заяўцы.

* * *

У Мінску пабывалі прадстаўнікі міжнароднай федэрацыі гістарычнага фехтавання Раберта Гоці і Маўрыцыа Рандацца — двухразовы алімпійскі чэмпіён па фехтаванні 1996 (Атланта) і 2000 (Сідней) гадоў і ў цяперашні час саветнік міжнароднай федэрацыі гістарычнага фехтавання.

Паказальныя спаборніцтвы па гістарычным фехтаванні пройдуць 22 і 23 чэрвеня 2019 года на пляцоўцы ў гістарычным цэнтры Мінска — Верхнім горадзе. Яны будуць суправаджацца выстаўкай старадаўніх кніг, шпаг і фехтавальных масак у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага ў перыяд з мая па жнівень 2019 года.

У сувязі з гэтым Раберта Гоці і Маўрыцыа Рандацца абмеркавалі з прадстаўнікамі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» шэраг пытанняў па падрыхтоўцы і арганізацыі ў рамках культурнай праграмы II Еўрапейскіх гульняў спаборніцтваў па гістарычным фехтаванні і спадарожнай выстаўкі, а таксама наведалі музей Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

# «АДДАЮСЯ СПОРТУ, А ЁН — МНЕ»

## Чэмпіёнка Еўропы Ірына Курачкіна раскрывае сакрэты сваіх перамог

**З 15 відаў спорту, якія ўвайшлі ў праграму II Еўрапейскіх гульняў, барацьба з'яўляецца адным з самых перспектыўных для нас у плане заваявання медалёў. На нядаўнім чэмпіянаце Еўропы ў расійскім Каспійску беларусы атрымалі дзевяць узнагарод, шэсць з іх належаць дзяўчатам. Ірына Курачкіна стала ўладальніцай «золата» і сёння з'яўляецца адной з самых тытулаваных атлетак краіны ў гэтым відзе спорту. Сярод галоўных яе турніраў у будучыні — Еўрапейскія гульні ў Мінску і Алімпіяда-2020 у Токіа, пра якія дзяўчына не хоча загадваць і сёння лічыць за лепшае працаваць. У інтэрв'ю «Звяздзе» чэмпіёнка Еўропы расказвае пра тое, якой цаной далося ёй «золата» і чаму жаночая барацьба больш жорсткая за мужчынскую.**

***— Ірына, з якімі мэтамі ехалі на чэмпіянат Еўропы ў Каспійск?***

— Вядома, хацелася выйграць медаль, але якой вартасці, загадваць не магла. На зборах рыхтавалася да гэтага старту, на спаборніцтвах стаяла задача ўсю праведзеную работу паказаць на справе, лічу, што ў мяне гэта атрымалася.

***— Ці складана было дайсці да фіналу?***

— У прынцыпе, практычна ўсіх саперніц, з якімі даводзілася змагацца, я ведала, сустракалася з імі на розных турнірах. Але настройвалася на ўсіх аднолькава сур'ёзна, простых сутычак не было. У фінале сустрэлася з пераможцай I Еўрапейскіх гульняў, прызёркай чэмпіянату свету 2017 года, тытулаванай спартсменкай Раксанай Мартай Засінай з Польшчы. Да канца сустрэчы заставалася тры долі секунды, а я ўжо пачала святкаваць перамогу і ледзь не паплацілася за гэта. Саперніца скарысталася маёй расслабленасцю і правяла прыём, атрымала ацэнку, бо яшчэ не было свістка суддзі, які знаходзіцца на дыване. Па якасці дзеянняў у мяне былі падвойныя балы, таму пашанцавала, я выйграла. Гэтую памылку мы ўжо абмеркавалі з трэнерамі і зрабілі высновы, што змагацца трэба да канца.

***— Перамогу ў Каспійску можна назваць адной з самых каштоўных у вашай скарбонцы?***

— Усе вынікі для мяне важныя, нават калі гэта не першае месца, а пятае. Калі яно заслужанае, калі ты адчуваеш сябе добра і вядзеш атакуючую барацьбу, то любы вынік ацэньваю як станоўчы. Кожны медаль — гэта цана тваёй працы. Вядома, «золата» чэмпіянату свету ці Алімпійскіх гульняў — гэта самыя каштоўныя ўзнагароды, але чэмпіянат Еўропы таксама важны, гэта адзін з этапаў падрыхтоўкі да іншых спаборніцтваў.

***— Ведаю, што пасля яго на вас абрынулася ўвага журналістаў.***

— Скажу шчыра, для мяне гэта нязвыкла. Усё на публіцы, моманты і сямейнага, і асабістага характару, а я гэтага не люблю. Таму такая ўвага выклікае дыскамфорт, псіхалагічна я ад гэтага стамляюся. Хоць, калі запрашаюць на тэлебачанне, інтэрв'ю для газет і часопісаў, я з радасцю адгукаюся, прыемна, што пра мяне ўспамінаюць, што кажуць аб барацьбе.

***— На малой радзіме вас пазнаюць?***

— Я з пасёлка Круглае Магілёўскай вобласці, ён настолькі невялікі, што і так усе адно аднаго ведаюць. Мяне рэгулярна віншуюць з поспехамі, пішуць пра іх у мясцовых газетах.

***— Вы з'яўляецеся адной з самых тытулаваных спартсменак у беларускай жаночай барацьбе, у чым сакрэт поспеху?***

— Поспех — гэта жаданне, праца і цярпенне. Я займаюся любімай справай, аддаюся спорту, а ён — мне, гэта такая ўзаемасувязь. Проста трэба любіць сваю справу і ўвесь час імкнуцца перамагаць.

***— Часта даводзіцца чуць, што барацьба — не жаночы від спорту?***

— Часцей за ўсё пра гэта кажуць дылетанты або хлопцы. Бокс — таксама не жаночы від спорту і ўсе астатнія адзінаборствы, але людзі трэніруюцца, выступаюць. Крытыку збоку я ўспрымаю нармальна, калі камусьці не падабаецца барацьба, гэта ж не значыць, што трэба сыходзіць або закрываць гэты від спорту, ён алімпійскі, значыць, людзі лічаць, што ён павінен быць. Перш за ўсё стараюся прыслухоўвацца да сябе, а не да навакольных. Мая сям'я прымае тое, чым я займаюся, сябры падтрымліваюць.

***— Хвалюе, як вы знешне выглядаеце падчас паядынку?***

— Не, я ж не на подыум выходжу. Перш за ўсё думаю пра тое, каб нічога не замінала, таму, напрыклад, мы выходзім на дыван з заплеценымі валасамі. Стараемся рабіць адна адной прычоскі.

***— Ёсць меркаванне, што жаночая барацьба на парадак больш жорсткая за мужчынскую...***

— Жаночая барацьба больш эмацыянальная. Наконт бруднай барацьбы, можа, у жаночай гэтага крыху больш. Дзесьці саперніца можа схапіць цябе за пальцы, на чэмпіянаце Еўропы ў Рызе, калі я стала другой, змагалася з украінкай, яна хацела зрабіць прыём і запусціла мне руку ў валасы, як бы ўзяла захоп. Я адрэагавала гэтак жа, таксама запусціла ёй руку ў валасы і паказала, што так не пройдзе. Сапраўды бываюць моманты, калі дзяўчаты могуць дазволіць сабе больш за мужчын.

**«У жыцці ж таксама часта даводзіцца абараняць сябе, і я гэта раблю».**

***— Якія траўмы найбольш распаўсюджаныя ў барацьбе?***

— Праблемы з каленямі і плячыма. Мяне яны, на шчасце, пакуль абыходзілі бокам, была аперацыя на шыі — міжпазваночная грыжа, але гэта не так страшна.

***— Пэўная вагавая катэгорыя абавязвае пастаянна сачыць за сваімі кілаграмамі...***

— Ёсць урачы, спецыялісты, якія займаюцца дыетычным харчаваннем, дзесьці спартсмен сам можа прытрымліваць вагу. Калі мне трэба крыху скінуць, прыбіраю салодкае і мучное, пераходжу на мяса без гарніраў, раблю меншыя порцыі. У гэтых адносінах для мяне няма ніякіх складанасцяў.

***— Вы выступаеце ў вагавай катэгорыі да 55 кг, на Алімпійскіх гульнях будзе катэгорыя да 57 кг, што плануеце рабіць?***

— Будзем набіраць вагу: 55 кг я прытрымліваюся, а 57 кг — гэта аптымальна для мяне, пытанне ў тым, каб не проста набраць форму ў гэтую патрэбную катэгорыю, а добра падвесці сябе да Алімпіяды. Тут ужо будзем працаваць з трэнерамі. Вельмі хочацца адабрацца на Гульні, таму што гэта галоўны старт чатырохгоддзя. Засталося два гады, здаецца, гэта маленькі тэрмін, але адначасова ён і вялікі. Галоўная задача цяпер не расслабляцца, рыхтавацца да любога старту. Наперадзе яшчэ будуць турніры, дзе можна паспрабаваць сябе ў новай катэгорыі.



***— У II Еўрапейскіх гульнях удзельнічаць плануеце?***

— Вядома, хацелася б, але я не люблю загадваць, лепш гэтага не рабіць, а проста верыць у лепшае.

***— На барцоўскім дыване вам неабходны характар, жорсткасць. Гэта потым адлюстроўваецца ў звычайным, не спартыўным жыцці?***

— У маім выпадку так. Я яшчэ не навучылася перастройвацца. Калі ты пастаянна жывеш у трэніровачным рэжыме, гэта складана. У жыцці ж таксама часта даводзіцца абараняць сябе, і я гэта раблю. Характар дае аб сабе знаць, сапраўды, не магу сказаць, што ў жыцці я дзяўчынка-дзяўчынка.

**«Бываюць моманты, калі дзяўчаты могуць дазволіць сабе больш за мужчын».**

***— Сукенкі, абцасы, шопінг?***

— Для мяне гэта вельмі цяжка. Мне падабаецца, калі на кімсьці надзеты спадніца, сукенка, глядзіцца класна, але мне лепш надзець шорты ці джынсы, красоўкі, балеткі, каб абутак быў мяккі і зручны. Я стараюся неяк змагацца з сабой, дзесьці надзець блузку, нафарбавацца, бо некаторыя мерапрыемствы абавязваюць, але пакуль гэта выклікае ў мяне дыскамфорт.

***— З дзяцінства марылі стаць спартсменкай?***

— Спачатку займалася лёгкай атлетыкай і паступіла ў вучылішча алімпійскага рэзерву менавіта па гэтым відзе спорту. Думкі пра тое, што буду займацца спортам прафесійна, паўсталі, калі перайшла на барацьбу.



**«Поспех — гэта жаданне, праца і цярпенне. Я займаюся любімай справай».**

***— Псіхалагічна складана даецца перыяд трэніровак і спаборніцтваў?***

— Спачатку было цяжка, калі ўвесь час знаходзішся ў рэжыме барацьбы — гэта трошкі душыць, але ёсць трэнеры, якія дадуць патрэбную параду, псіхолаг, які дапаможа разгрузіць абстаноўку. Людзі працуюць над тым, каб не загнаць спартсмена. Цяпер, калі ўжо ёсць вопыт, рабіць сваю працу стала прасцей.

***— Хто вашы галоўныя балельшчыкі?***

— Галоўны — гэта мой трэнер Артур Яўгенавіч Зайцаў, таму што ён заўсёды перажывае, заўсёды імкнецца падтрымаць, нават калі я прайграла, сказаць добрае слова, а не адразу пераходзіць у наступленне і да разбору памылак. Перажываюць, вядома, бацькі, сям'я. Радуюцца перамогам і ў федэрацыі, сябры, нават калі не заўсёды ў кагосьці атрымліваецца паглядзець паядынкі.

***— Чым займаецеся звычайна акрамя спорту?***

— Спорт — гэта і прафесія, і хобі. Ён — большая частка асабістага часу. Акрамя барацьбы люблю веласіпед, басейн, прагулкі, кінатэатр, кнігі, часопісы.

***— Зараз вы не замужам?***

— Не і пакуль не збіраюся. Мяне сітуацыя з замужжам ні кроплі не палохае, не шкадую, што цяпер цалкам аддаюся спорту. Як многія кажуць, магчыма, пашкадую потым... Усяму свой час, пакуль я не гатовая ні да сям'і, ні да адносін.

***— Які мужчына павінен быць побач са спартыўнай моцнай дзяўчынай?***

— Дакладна павінен быць мацнейшы за жанчыну, людзі павінны падыходзіць адно аднаму, гарманіраваць, прыслухоўвацца, умець падтрымаць. Наогул, калі адно аднаго любяць, то ўсё па сваіх месцах расставіць жыццё.

***— Якія мэты ў вас наперадзе?***

— Хацелася б выйграць чэмпіянат свету і ўзяць медаль Алімпійскіх гульняў, але загадваць рана, гэта ўсё праца, зараз я хачу працаваць і прысвячаць сябе сваёй справе.

■ Экспрэс-навіны

# РЭКОРДНЫЯ ВЫШЫНІ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра галоўныя навіны мінулых выхадных.**

***1. Лёгкаатлет Дзмітрый Набокаў устанавіў новы рэкорд Беларусі ў скачках у вышыню.*** На спаборніцтвах Рэспубліканскай універсіяды па лёгкай атлетыцы ў Брэсце Дзмітрый пераадолеў планку з першай спробы на вышыні 2 м 36 см. Папярэдні рэкорд краіны (2 м 34 см) быў устаноўлены Андрэем Санковічам у маі 1993 года і трымаўся на працягу 25 гадоў.

Другое месца на ўніверсіядзе заняў іншы вядомы беларускі скакун у вышыню Максім Недасекаў, які паказаў вынік 2 м 32 см.

***2. Беларускія валейбалісткі пацярпелі першае паражэнне ў залатой Еўралізе 2018 года.*** У Мінску на пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» яны саступілі саперніцам з Іспаніі з лікам 1:3. *«У гульні з Іспаніяй дапусцілі шмат памылак, не было надзейнага прыёму мяча, з-за чаго мы не выкарыстоўвалі свае козыры: надзейны блок і атакі першым тэмпам»*, — адзначыў **галоўны трэнер зборнай Пётр Хілько.**

Пасля трох матчаў на рахунку жаночай зборнай Беларусі ў Еўралізе дзве перамогі над Славакіяй (3:2, 3:0) і адно паражэнне ад Іспаніі (1:3). Наступныя матчы беларускі правядуць 30 мая ў Іспаніі, 2 чэрвеня — у Чэхіі, а завершаць папярэдні этап 6 чэрвеня дамашнім матчам з Чэхіяй.

Мужчынская зборная па валейболе выйграла ў Венгрыі ў сярэбранай Еўралізе з лікам 3:0. *«Пасля паражэння ад Харватыі (1:3) мы шмат увагі ўдзялілі прыёму мяча, пастараліся лепш дзейнічаць на блоку. У матчы з Венгрыяй задаволены, як згулялі нашы высокія нападаючыя на краях сеткі»*, — адзначыў **настаўнік беларусаў Віктар Бекша.**



Момант матчу Беларусь—Славакія.

Фота БелТА.

Хлопцы правядуць яшчэ тры матчы на выездзе. 30 мая беларуская каманда згуляе з Албаніяй, 2 чэрвеня — з Харватыяй, а завершыць групавы этап 6 чэрвеня выязной сустрэчай з Венгрыяй.

***3. Хакейны клуб «Лакаматыў» будзе створаны ў Оршы, паведамляе прэс-служба ФХБ.***

Новая каманда плануе выступаць у экстралізе чэмпіянату Беларусі. У Оршы ўжо пачалася праца па фарміраванні дружыны. У яе структуру на працягу года павінна ўвайсці спартыўная школа з аднайменнай назвай.

***4. Згуляны некаторыя матчы 9-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** «Мінск» з буйным лікам перайграў «Тарпеда» — 6:1, «Смалявічы» саступілі «Дынама-Мінск» — 0:2, «Шахцёр» перайграў «Гомель» — 2:1, «Прамень» і «Гарадзея» не змаглі выявіць пераможцу — 1:1

■

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Выставы

# Патрэбныя дзеці

## У Мінску можна ўбачыць кранальную фотавыстаўку пад адкрытым небам

**У экспазіцыі 23 фотаздымкі, на якіх выхаванцы Асіповіцкай дзяржаўнай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату. Кампанію для фота ім склалі прадстаўнікі розных прафесій ад прыбіральшчыцы да машыніста цягніка, а таксама вядомыя беларускія артысты і спартсмены.**



Сярод іх выканаўцы Анатоль Ярмоленка, Аляксандр Саладуха, Аляксей Хлястоў, Анастасія Ціхановіч, Іван Вабішчэвіч, харэограф Дзмітрый Пуйша, хакеіст Андрэй Касціцын і баскетбалістка Алена Леўчанка. Убачыць кранальныя чорна-белыя здымкі з моцным эмацыянальным пасылам можна ў апошнія дні мая на тэрыторыі Верхняга горада.

Прапанавалі стварыць фотавыстаўку валанцёры руху «Патрэбныя людзі». Праца над праектам вялася на працягу трох месяцаў, усе здымкі зрабіў фатограф Аляксандр Вафік. Актыўна падтрымалі ініцыятыву і прадстаўнікі адміністрацыі Цэнтральнага раёна сталіцы. На адкрыцці чырвоную стужку перарэзалі **кіраўнік валанцёрскага руху «Патрэбныя людзі» Вікторыя КРУТ** і **кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска Ігар БУЗОЎСКІ.**

— Такога роду ініцыятывы ўзнікаюць дзякуючы неабыякавым людзям. Такіх у нашым грамадстве нямала, і гэта радуе. Толькі ўсе разам мы зможам вырашаць існуючыя праблемы і дапамагаць дзецям з асаблівасцямі развіцця. Прычым не эпізадычна, а пастаянна, — падкрэсліў кіраўнік раёна.

Падчас праекта дзеці паспелі не толькі пафатаграфавацца, але і пагутарыць з цікавымі асобамі, а таксама апынуцца на значных аб'ектах, напрыклад у «Мінск-Арэне» і музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Мяркуецца, што такі досвед у будучыні дапаможа ім прасцей адаптавацца да ўмоў гарадскога асяроддзя, а саміх гараджан навучыць успрымаць людзей па-за залежнасцю ад іх асаблівасцяў.

**Дар'я КАСКО**

■ Падзеі

# Беларуска Вера Ярошык заняла другое месца ў вакальным шоу «Ты супер!»

**16-гадовая спявачка з аграгарадка Дзівін Кобрынскага раёна гучна заявіла аб сабе ў другім сезоне тэлевізійнага праекта «Ты супер!», які выходзіць на расійскім канале НТВ. Дзяўчына, якая выконвала песні на беларускай, рускай, украінскай і англійскай мовах, упэўнена дайшла да фіналу конкурсу, дзе заняла другое месца.**



У фінальным канцэрце, дарэчы, Вера Ярошык выканала разам з Русланам Аляхно вядомую песню «Зачараваная» на вершы Генадзя Бураўкіна — і сарвала авацыі залы і суддзяў. Як адзначыў адзін з членаў прафесійнага журы вакальнага шоу, кампазітар і прадзюсар Віктар Дробыш, для Веры Ярошык заўжды адкрытыя яго «сэрца, студыя і кампанія».

Вера Ярошык з трох гадоў выхоўваецца ў Дзівінскім дзіцячым доме, куды трапіла разам з братам з-за таго, што бацькі былі пазбаўленыя дзіцячых правоў. Цяпер дзяўчына вучыцца ў дзясятым класе, іграе на цымбалах і піяніна, удзельнічае ў розных творчых конкурсах (некалькі гадоў таму Вера стала фіналісткай тэлеконкурсу «Я спяваю» на канале АНТ) і плануе звязаць сваё жыццё з музыкай.

«Ты супер!» — міжнародны тэлевізійны вакальны конкурс для таленавітых дзяцей ва ўзросце ад 8 да 18 гадоў, якія засталіся без апекі бацькоў. Сёлета ў ім удзельнічалі 83 юныя артысты з 13 краін, а да фіналу дайшлі 11 чалавек. Усе яны ў якасці спецыяльных падарункаў ад арганізатараў атрымалі запрашэнне ў міжнародны дзіцячы цэнтр «Артэк», штомесячную стыпендыю да дасягнення 18 гадоў і запіс песні ў прафесійнай студыі.

# Прывітанне з дзяцінства

**Яго даслала сваім слухачам радыё «Мір» напярэдадні ўласнага дня нараджэння. Папярэдне, праўда, вядучыя распыталі, пра якія падарункі радыёслухачы марылі ў дзяцінстве, але так і не атрымалі іх.**




Як высветлілася, дзіцячыя мары ў беларусаў, якім сёння 30—45 гадоў, былі разнастайныя. Найчасцей прасілі ў бацькоў хатніх жывёл (ката ці сабаку), хлопчыкі — машынкі на радыёкіраванні, дзяўчаты — лялек, каляскі і домікі для іх. Зрэшты, гендарныя стэрэатыпы аказаліся разбураныя дзявочымі марамі пра шлем, кінжал у ножнах і машынкі. Таксама сярод жаданых дзіцячых падарункаў называлі канькі, ровары, фотаапарат, набор для выпальвання, тэлескоп, глобус, дыяпраектар, набор «Юны хімік». А як шмат з нас марылі пра зборную чыгунку, «Тамагочы», прыстаўку Dendy — памятаеце? Самымі ж нечаканымі з падарункаў сталі жвачка «Турба» і вялікая бляшанка згушчонкі...

Многія слухачы адзначылі, што рэалізуюць мары цяпер, набываючы ўжо ўласным малым тое, што самі хацелі ў дзяцінстве. «У нас дзве дзяўчынкі, але, нягледзячы на гэта, у доме ёсць і машынкі з пультам кіравання, і галава чэрапа з пісталетам, і Спайдэрмен з Бэтменам, і мех з мяккімі цацкамі. Гэта муж, у якога ў дзяцінстве наогул не было цацак, адрываецца напоўніцу», — прызналася адна з жанчын.

«Я ў дзяцінстве таксама марыў пра «Тамагочы», але бацькі адмовіліся яго купляць, каб я не засмучаўся, калі той памрэ. Другой запаветнай марай быў верталёт на радыёкіраванні. Яго я атрымаў ужо дарослым ад жонкі і дагэтуль памятаю, якое захапленне тады адчуў», — успамінае вядучы ранішняга шоу «Пад'ёмная сіла» Аляксей Клачкоў. Разам з напарнікам, вядучым Антонам Палычам, 25 мая, адразу пасля эфіру, яны загрузілі машыну падарункамі і цэлы дзень калясілі па сталіцы, здзіўляючы і радуючы ўжо дарослых хлопчыкаў і дзяўчат. «Быць у ролі выканаўцы жаданняў спадабалася: што можа быць лепшым, чым бачыць усмешкі і радасныя вочы нашых слухачоў!» — гавораць вядучыя.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Навінка

# Першае музычнае YouTube-шоу ўжо і ў нас

**Стартаваў маштабны YouTube-праект «Смялей». Прадстаўнікі аднаго з камерцыйных банкаў абвясцілі кастынг, фіналісты якога змогуць тры месяцы займацца вакалам з зорнымі настаўнікамі. Пераможцу чакаюць 2 тысячы долараў у эквіваленце, уласны кліп і народная слава, распавялі арганізатары.**

«Смялей» стане першым у Беларусі музычным YouTube-конкурсам. Праявіць сябе зможа кожны, каму больш за 18 гадоў, незалежна ад прапіскі і вакальных здольнасцяў. Разам з маладымі музыкамі змогуць спаборнічаць і вядомыя артысты. Фіналістам дапамогуць павысіць майстэрства, выйсці на сцэну і здабыць вядомасць.

Кастынг пройдзе па ўсёй краіне, а ў фінал трапяць шэсць выканаўцаў. На працягу ўсяго лета ім трэба будзе працаваць з настаўнікамі, сярод якіх — тры прадстаўнікі шоу-бізнесу і столькі ж музычных блогераў. Прамежкавыя выступленні кожны тыдзень будуць трансляваць на YouTube-канале InSyncTV, а суперфінал адбудзецца ў пачатку верасня. Пераможца, якога выберуць гледачы з дапамогай праглядаў і каментарыяў, скончыць праект з грашовым прызам, уласным кліпам, ратацыяй трэка на радыё Unistar і, магчыма, з 1 млн праглядаў на YouTube.

Для ўдзелу трэба запісаць сваё выступленне на відэа і выкласці да 10 чэрвеня ў сваю сацсетку з хэштэгам *#альфакастынгсмялей.* У двуххвілінным запісе трэба сябе прадставіць, абгрунтаваць цікавасць да праекта і выканаць кароткую версію трэка — аўтарскую кампазіцыю або кавер. Паказаць можна як ролік з крэатыўным выкананнем, так і звычайны нумар, скажам, з гітарай.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Святы

# У ГАСЦЯХ У ЯРОМЫ З ЯРОМІХАЙ

## У Карэліцкім раёне прайшоў фестываль масак

**Пусціцца ў скокі са страусам, рыбай і жабай, пагладзіць ільва, тыгра і слана, сфатаграфавацца з казой, пеўнем і буслом, паслухаць казку зайца, лісы і мядзведзя... Усё гэта і шмат іншага можна было зрабіць на першым фестывалі масак «Ярома і Яроміха запрашаюць», які ў выхадныя прайшоў у аграгарадку Ярэмічы.**



Гаспадары свята — дзед-Ярома і баба-Яроміха, якія жывуць каля Нёмана і маюць вялікую гаспадарку. Разам з жывёламі са свайго падворку — сабакам, катом, кароўкай, страусам, свіннёй, пеўнем, казой ды куркай, — суседзямі з ракі: жабай, рыбай ды буслам, а таксама з гасцямі-лялькамі з суседняга Навагрудскага раёна героі прайшліся па аграгарадку. Па дарозе шэсце збірала ўсіх цікаўных. Сапраўды, не кожны дзень сустрэнеш на вуліцы вярблюда ды малпу.

У Гродзенскай вобласці тры калектывы, якія займаюцца лялькамі. Гэта Беларускі іграві тэатр роставых лялек «Dolls4All» з Дзятлава, тэатр лялек «Шчарсунок» з аграгарадка Шчорсы Навагрудскага раёна і самабытны калектыў з Ярэміч — народнае аматарскае аб'яднанне «Закрытыя твары». Месцажыхарства апошняга і натхніла арганізатараў стварыць на ярэміцкай зямлі самабытны фестываль, які, як спадзяюцца, стане брэндавым святам мястэчка.

Ярома з Яроміхай расказалі ў тэатральнай лялечнай замалёўцы, як яны жывуць: карову дояць, птушак кормяць, рыбу вудзяць, з буслам сябруюць. А леў, тыгр ды слон паказалі сапраўднае цыркавое прадстаўленне. Юныя акцёры з тэатра «Шчарсунок» парадавалі гледачоў лялечнай казкай пра небараку-зайца ды вожыка-свавольніка, які ўсіх звяроў у лесе крыўдзіў, нават лісу з воўкам ды мядзведзем.

— Мы спадзяёмся, што фестываль стане пастаянным і да нас будуць далучацца іншыя калектывы. Ужо цяпер відаць, як зацікавіліся відовішчам не толькі дзеці, але і дарослыя. Тым больш што гледачу не толькі паказваюць прадстаўленне, а і ўцягваюць людзей у працэс, — расказала **Іна САНЧУК, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Карэліцкага раённага выканаўчага камітэта.** — Спецыяльна да фестывалю мы прыдумалі новыя гульні і конкурсы. А пад герояў, якіх несупынна стварае кіраўнік калектыву «Закрытыя маскі» Марыя Пятроўна Крэнь, мы пастаянна пішам новыя сцэнарыі і замалёўкі. Вось нядаўна майстрыха зрабіла шыкоўную лісу, і рыжая хітруха ўжо бегае на свяце.




Сапраўды, прысутныя маглі не толькі паглядзець выступленні лялек і паслухаць нумары мясцовых эстрадных выканаўцаў са сцэны, але і пагутарыць ды пагарэзіць з казачнымі жывёламі, уцягнуцца ў масавую гульню і проста парадавацца, што такое яскравае мерапрыемства прайшло бадай што пад вокнамі роднай хаты.

— Мы прыехалі ў Ярэмічы на дзень нараджэння да зяця і былі прыемна здзіўлены такім святам. Прыйшлі з дзецьмі і ўнукамі, цудоўна правялі час. Усё арганізавана належным чынам. Нашы хлопчыкі вельмі задаволены. Ды і ўсе навокал танцуюць, спяваюць, — падзялілася ўражаннямі **Наталля БІРУЛЯ, цяперашняя мінчанка, якая родам з суседняй вёскі Браносава.**

— Я ў раённай газеце прачытала пра свята і вырашыла паглядзець, як гэта будзе. Весела, прыгожа, народ сабраўся, і прыезджых шмат. Часцей бы такое праводзілі, — пажадала **Таццяна ТАНАНКА з суседняга аграгарадка Турэц.**

— Тут весела і так прыгожа ўсё зроблена. Мне вельмі спадабаўся бусел, я таксама ў такім касцюме пабегаў бы, — далучыўся сын Таццяны Міша, які прыбег да мамы ўзяць грошай на конкурс і праз хвіліну знік, пабег весяліцца.

Не давалі сумаваць гледачам і супрацоўнікі Карэліцкага цэнтра культуры і народнай творчасці, якія стварылі на свяце перформанс. Дзяўчаты ў вобразах мімаў моўчкі дарылі дзецям і дарослым маскі з паперы і жэстамі прапаноўвалі рабіць з імі своеасаблівыя партрэты з рамкай. Ад ахвотных не было адбою. Дадайце да гэтага батут для дзетак, конкурсы, салодкія пачастункі — і зможаце яшчэ больш уявіць атмасферу, што панавала на свяце. Аднак, каб адчуць гэта цалкам, трэба пабачыць усё на ўласныя вочы. Наступным годам лялькі ізноў будуць чакаць сустрэчы.

**Ірына СІДАРОК**

## Даты | Падзеі | Людзі

### 29 МАЯ

**У краіне**

**1850** год — нарадзіўся (в. Чэрнін, цяпер у Светлагорскім раёне) Аляксандр Нічыпаравіч Шыманоўскі, беларускі этнограф і фалькларыст. Аўтар рукапіснага зборніка «Мінская губерня і яе народная творчасць у сувязі з апісаннем свят і абрадаў» (захаваўся ў архіве Рускага геаграфічнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу), у якім сабраны каштоўны матэрыял па беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі, выкладзены яго погляды на народную творчасць. У зборнік уключаны бытавыя, салдацкія, гістарычныя і іншыя песні, казкі, павер'і, загадкі, гаспадарча-этнаграфічныя назвы. Выдаў кнігу «А. С. Пушкін. Аб знаходжанні яго ў Кішынёве...». Памёр у 1918 годзе.

**1913** год — нарадзіўся Іван Сідаравіч Кавалёў, вучоны ў галіне прыкладной электрадынамікі і радыёэлектронікі, доктар тэхнічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Аўтар больш як 50 навуковых прац, у тым ліку трох манаграфій. Навуковыя працы па тэорыі і аптымізацыі радыёэлектронных прылад звышвысокіх частот, прыкладной электрадынаміцы і інш. Памёр у 1987 годзе.

**1913** год — нарадзіўся (в. Заполле, цяпер у Карэліцкім раёне) Мікалай Пятровіч Арцюх, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. З 1932 года — сакратар Карэліцкага падпольнага райкама КСМЗБ. Удзельнічаў у распаўсюджванні лістовак, зборы сродкаў сярод насельніцтва для МОПРа. Пад яго кіраўніцтвам навучэнцы Запольскай школы патрабавалі навучання на роднай мове, у дні рэвалюцыйных свят камсамольцы вывешвалі чырвоныя сцягі. У сувязі з узмацненнем жорсткасці рэпрэсій улад перайшоў на нелегальнае становішча. Падчас перастрэлкі з польскай паліцыяй быў паранены і заколаты штыком. Імем М. Арцюха названа вуліца ў Карэлічах, у скверы ўстаноўлены яго бюст. У Запольскай школе створаны музей рэвалюцыянера.



**У свеце**

**1787** год — нарадзіўся Канстанцін Бацюшкаў (1787—1855), рускі паэт. Адукацыю атрымаў у прыватных пансіёнах у Пецярбургу. Быў на чыноўніцкай і ваеннай службе, пазней — у рускай дыпламатычнай місіі ў Італіі. Аўтар элегій «На руінах замка ў Швецыі», «Пераход праз Рэйн», «Мой геній», цыкла нарысаў і артыкулаў пра літаратуру і мастацтва.

**1873** год — нарадзіўся Мікалай Эрнэставіч Баўман (1873—1905), рэвалюцыянер. Рэвалюцыйную дзейнасць пачаў у 1890-х гадах у Казані. Праводзіў заняткі ў рабочых гуртках. У 1896—1997 гадах — член Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа». У 1899 годзе сасланы ў Вятку, адкуль збег за мяжу. Удзельнічаў у выданні газеты «Искра». Арганізаваў на сваёй кватэры нелегальную друкарню. Забіты падчас рэвалюцыйнай дэманстрацыі ў Маскве ў 1905 годзе. Імем рэвалюцыянера названы вуліцы ў Бабруйску, Брэсце, Віцебску, Гомелі, Магілёве, Слуцку.

**1953** год — нарадзіўся Аляксандр Абдулаў (1953—2008), рускі савецкі акцёр тэатра і кіно, народны артыст РСФСР. Зняўся ў фільмах «Памінальная малітва», «Той самы Мюнхгаўзен», «Формула кахання» і многіх іншых.

**1953** год — новазеландзец сэр Эдмунд Персіваль Хілары і шэрп Тэнцынг Норгей упершыню ў свеце здзейснілі паспяховае ўзыходжанне на найвышэйшую вяршыню ў Гімалаях — Эверэст (Джамалунгма, 8848 м).

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.48 | 21.27 | 16.39 |
| Віцебск | — 4.30 | 21.24 | 16.54 |
| Магілёў | — 4.38 | 21.17 | 16.39 |
| Гомель | — 4.43 | 21.05 | 16.22 |
| Гродна | — 5.05 | 21.41 | 16.36 |
| Брэст | — 5.14 | 21.33 | 16.19 |

**Месяц**

***Поўня ў 17.19.***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

**Імяніны**

***Пр.** Аляксандра, Георгія, Фёдара, Яфрэма.*
***К.** Марыі, Уршулі, Аляксандра, Максіма, Пятра.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Пасля вывучэння «Камасутры» высветлілася, што найбольшую перавагу жанчыны аддаюць позе «давай заўтра».

**— Дзяўчына, я абсалютна вольны!**
**— Пачакайце, мужчына, давайце ўдакладнім: вольны ці нікому не патрэбны?**

Чэмпіён свету па скачках у ваду закідвае пельмені ў каструлю без пырскаў.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1986.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 мая 2018 года.